Беларуская газэта
Naša Niva

НАША НІВА

№5
студзень 1992
кошт 2 рублі

Новая Культурная Сітуацыя



Койданаўцы

Навэлі з аповесьці

А Г



Іван

Іван сядзеу на зэдліку пасярод пакою й засяроджана пазіраў на ўласныя ногі. Белая, накрухмаленая да сінечы кашуля так напялася на Йванавым круглым жываце, што, здавалася, вось-вось гузікі ня вытрымаюць ды пакоцяцца па розных кутках Бурачковы атласны гальштук ляжаў на сытым плячы, не раўнуючы, як сабачы язык Загарэлую лысіну абсыпалі драбнюткія пацеркі поту Пасястая шкарпэтка спраўна сядзела на ступаку. Іван паварушыў пальцамі другой босай нагі і ўздыхнуў так цяжка, нібыта зьбіраўся на пахаваньне, а не на вясельле да сваякоў. — Казік Кісялевіч выдаваў замуж дачку Гэлю

— Бацька, што ты сядзіш? Мы чакаем, а ён сеу тут і уздыхае, як той кабан у загарадцы, — Іванава жонка Міля падбегла да люстэрка й яшчэ раз мо ўжо пяты, падфарбавала вусны

— А идзіце вы ўсе, ліха вашай матары Не пайду я нікуды, — Іван забурчэў у падлогу. — Чорт зь ім, зь вясельлем Абыйдуся.

— Бацька, а што ж гэта на цябе найшло? — са сьвяточнай і вясёлай Міля стала перапалоханая — Толькі што зьбіраўся... Усе зьбіраліся йсьці Падарункі на ганку стаяць Дык што здарылася?

— Нічога. Не пайду, і ўсе Не хачу Перадумаў! — Іван, сьцягваючы праз галаву падобны да сабачага языка гальштук, ускудлаціу вянок сівых валасоу на патыліцы

— А Божачка мой, звар'яцеў наш бацька!

Іван скамечыу гальштук і шпурнуў яго пад канапу

Міля памкнулася у сенцы і зь іх закрычала да сына у двор

— Алесь, сынок, хадзі ў хату

Тым часам Іван пайшоў да канапы, лег і заклаў рукі пад галаву

Алесь заскочыў у пакой з такім выглядам, нібыта зьбіраўся ўбачыць зялёнага цмока пасярод хаты, а не роднага бацьку, які заплюшчыў вочы і ўдаваў, нібыта сьпіць.

Іван, вядома, ня спаў Але будзе й такі выпадак, калі ён засьне, сам таго ня хочучы Ён састарэе, пойдзе на пэньсію са свайго маторнага заводу, дзе вечарамі паціху, каб ня бачылі тыя, каму ня трэба, рабіў чыгунныя формы для пірагоў У Койданаве гэта былі найлепшыя формы. І ў сыботу перад Вялікаднем усё мястэчка згадвала добрым словам Івана Кубло

Але аднойчы Іван, сам таго ня хочучы, заснуў

— А дзе бацька? — спытаў тады Алесь у маці

— Можа, на двор пайшоў, — спакойна адказала Міля

Хата ў Івана была невялікая: калідор, кухня і тры пакоі Гэта пазьней, калі

(Працяг на староньцы 4)

«Партызанаў, калі ня ловяць, дык таму, што баяцца»

Даклад прафэсара Іваноўскага
З архіву НН

Якой убачыў Беларусь канцы 1941 га ваеннага году прафэсар Іваноўскі — адзін з пачынальнікаў беларускага руху яшчэ ў мінулым стагодзьдзі, а цяпер — старшыня Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні? Пратакол ягонага расповяду пра падарожжа ў Менск на незвычайным паседжаньні Прэзыдыюму БНК 11.XI.1941 — занадта канспэктыўны, многае ў ім трэба высьвятляць, а нешта ўжо ня будзе высьветленае ніколі. І ўсё ж гэтыя урыўкі фразаў, якія мы друкуем без усялякіх зьменаў — як імгненныя здымкі, якія даносяць да нас сітуацыю часу Галоўнае, што прыцягвала ўвагу прафэсара — станаўленьне беларускай цывільнай адміністрацыі, паліцыі, школы царквы На ўсё гэта прызнаны дзеяч нацыянальнага адраджэньня глядзеў досыць скептычна. Ясна чаму — мала людзей, працуюць ня надта эфэктыўна і — ці тыя гэта людзі?

Ня будзем зараз расшыфроўваць факты й біяграфіі згаданых у пратаколе людзей Згадаем хіба, што Радаслаў Астроўскі — былы член кампартыі Заходняй Беларусі і дырэктар Віленскай беларускай гімназіі — вярнуўся ў Менск разам зь немцамі, пэўны час пабыў на Беларусі, потым — з фронтам — пайшоў далей, на Ўсход Пазьней ён яшчэ вернецца ў Менск.

Згадаем таксама пра барацьбу беларусаў з палякамі за давер у нямецкіх акупантаў, імкненьне перахапіць уладу на мясцох Адносіны паміж прэтэндэнтамі складаліся надта непрыязныя Спачатку палякі захапілі ўладу, выстаўляючы беларусаў спрэс бальшавікамі потым беларусы сям-там пачалі браць рэванш Пра гэта таксама згадваецца ў пратаколе.

Тэкст падрыхтаваны да друку пры ўдзеле Лявона Луцкевіча

Як Астроўскага нястала, дык усе намінацыі ідуць праз рукі немцаў Агранічэньні ў слуханьні радыя

Што да А[строўскага], праф[эсар] уважае, што і ён сам вінаваты Труднасьці ў ням[ецкім] яз[ыку]. Мела быць шк[ола] паліц[ыі] — немцы сказалі, што нятрэба Вінав[атыя] крыху і самі белар[усы] (4 мес[яцы]). Касмовіча — нач[альніка] паліц[ыі] — звольнілі немцы Касмов[іча] і яго банду — трэба разагн[аць]. Шапкі, адзежа. Кушэль пэцкаўся, пісаў статут Шав[елю] давалі працу Генэр[альнага] інсп[эктара] паліц[ыі] Скасав[аньне] Бел[арускага] Чырв[онага] Крыжа — захац[еў] Кубэ Трэба падтрымл[іваць] знос[іны] з ССД На месца — Бел[аруская] Народн[ая] Самапомач — на чале немец, адным з загадч[ыкаў] аддз[елу] др Ерм[ачэнка] з намін[ацыяй] з Прагі Каізэр — аграномы — шк[ола] сел[ьска]-гаспадарч[ая] для сталых людзей Шапэрко — дыр[эктар] балотн[ай] станцыі Доц[энт] Зубковіч. Моцны контынг[энт] у сельск[а]-гасп[адарчай] шк[оле] Цягнуць якнайб[ольш] людз[ей] у М[енск] Сядзяць палякі або маскалі Дысцыпліна савецкая Няма добрага кіраўніцтва Марнаваньне часу

<u>5 — пункт</u> дзе немцы прых[ільна] да белар[усаў] аднос[яцца] Сказ[алі], што тэатр мусіць быць збеларушчаны Дыр[эктар] Краўчонак Адсутнасьць у часе прадстаўленьня — .. Інстр[уктар] з Бэрліну Забраць Булгака — curiculum vitae [жыцьцяпіс] Білетэрка

<u>Школы</u> — усе абсадж[аныя] беларус[амі], у Усх[одняй] Б[еларусі] — абсалютна, у Зах[одняй] — Навагр[адчына] уся, Стаўп[ецчына] — 48 небел[арускіх] замяніў на бел[арускія] у Маладэчн[е] з вын[яткам] 1 вол[асьці], дзе войт паляк, усе збеларушчыў. Быў [у] Стоўп[цах], Нав[аградку], Лідзе, Шчуч[ыне] і ў Ваўкавыску Пара арганіз[оўваць] бел[арускія] школы Загадч[ык] беларус.

<u>Веска</u> — больш-менш здаволена Была-б больш задав[олена], каб немцы далі позыт[ыўны] факт і адозва — зямлю вашу будзеце мець на ўласн[асьць] Парт[ызанаў] калі ня ловяць, дык таму, што баяцца Партызаны — чужы элемэнт Шавель няд[аўна] злавіў 4 аф[іцэры]. 1 маёр, ст[арэйшы] л[ейтэнант], топограф і адз[ін] падк[інуты] на самалёце

<u>Справа Касьцела і Цэркві</u> 3 ксяндзы Рыбалт[оўскі] — у Лагойску Будн[імі] днямі на вёсцы [дабіраецца] самах[одам], фурм[анкай] У тэатры, 2 хоры: прафэсыян[альны] іураднікаў г[орада] Менску 500 чал[авек] у Касьцеле Хрост і катэхіз і жаніцьба пабеларус[ку] Патрэба кніж[ак] 38 кс і 3 законы 1 муж і 2 ж Кс. Спэрскі — казён[ная] кватэра Кс Вінцэсю [Гадлеўскаму?] у Рыгу Біскуп Слоцкан На царкоўн[ай глебе] — лепей Нарко прыехаў Меўся быць пасьв[ечаны] у Біск[упы] Пантал. і Ражноўскі Інтрыгі Влодз Фінкоўскага — русапед і др

Недахват цэнтру Бел[арускі] Центр у Бэрліне існуе — трэба перац[ягваць] яго больш да краю. Няхват людзей У Баранав[ічах] газ[эта] у 3-х мовах паням[ецку], бел[аруску] і поль[ску] У Лідзе — камісар спрыяе Працуюць Камітэт Са Шчучынам яшчэ не навязалі кантакту. З Васілішкамі зняслыіся. Не пачаўся шк[ольны] год Роля кс Вінцэся [Гадлеўскага, галоўнага школьнага інспэктара Беларусі]. Людзк[ія] рэзэрвы Кушэль напісаў рэгулямін муштры У Стоўпцах — Аўдзей Трэба якіх 15 дольмэтшэраў [перакладчыкаў] у М[енск] Ходзіць Dienstpost [службовая пошта] Нач[альнік] паліц[ыі] у Слоніме — Ушнік, беларус У Шчучыне Ліневіч — старастай У Ваўкавыску — палякі нароўні з жыдамі Трэба падаслаць дэлегата для арганізаваньня бел[арускіх] школ Нядаўна зьлікв[ідаваныя] палякі ў Нясьвіжы Астр[оўскі] выехаў у Бранск Арганізав[аньне] Клюбу ў Менску У Навагр[адку] — шк[ольны] інсп[эктар] Орса.

Летні краявід з асьнежанай магілай

ЭСЭ

Алесь Бяляцкі



— Ты хоць фатаздымак ягоны бачыў?
— Але
— Можа ты яго са Сваяком блытаеш?
— Не. Ён рахманы такі, ураўнаважаны У Сваяка вочы гарачь.
— Хварэў бы ты на сухоты, і ў цябе б гарэлі

* * *

Зь Вітэбску я паехаў у Сянно Там пахваны Андрэй Зязюля — беларускі ксёндз і паэта Астрамовіч Памёр ён у 21-м годзе, меўшы веку сорак два гады. Я еxаў і думаў чаго памёр? І не стары яшчэ быў. І не ад голаду Захварэў мабыць, і памёр.

Пры саветах Зязюлю замоўчвалі доўга бо ксёндз. І нікога не цікавіла, што ксёндз гэты — зь сялянаў на простай мове казаньні прамаўляў ды вершыкі складаў

А можа й добра, што памёр? Хоць гвалту ў старасьці не зазнаў ад мясцовых хунвэйбінаў З ксяндзамі па гэты бок мяжы разьбіраліся люта Да 39 га году здаецца, ніводнага незачэпленага не засталося Галоўны іхні — папа — у капкраіне, а гэтыя, натуральна, — прамыя агенты. Не ратавала й беларуская мова. Ксёндз Сак таксама вершыкі па-беларуску складаў. Найперш змусілі адмовіцца ад сану а пасьля ўсё адно забілі. Зьліквідавалі

Вось і сумняваесься ці варта было чалавеку жыць далей.

Гілеи — усё у крыві

А зямля ўсмоктвае і нічога Жывем Хоць бы што

Але ж нельга ўхваляць сьмерць бліжняга. Нават ад спачуваньня. Мо' й выжыў бы як-небудзь Выкараскаўся. Уцёк, скажам, у Польшчу ці ў Латвію. Зьехаў бы ў Кітай, як ксяндзы Цікота і Германовіч. Праўда, і там іх дасталі, кітайскія камуністы. Вярнулі ў савецкія лягеры. І ўсё адно... Кожны павінен прайсьці свой шлях, які б ён ні быў, цяжкі ці лёгкі. Таму няма чаго шкадаваць. Яшчэ невядома, што з намі ўсімі будзе праз тры гады

* * *

За акном пасажыркі між тым — дзіўныя краявіды Вітэбскія пагоркі ды лагчыны Нешта сьпее-жаўцее на невялікіх палёх. Жыта ўжо, мабыць, пажалі А як выразна ўсё, як акрэсьлена! Цеплыя жоўтыя палі н аксамітныя ласкавыя лясы, і сіняе неба зь белымі іскрыстымі аблокамі Прыгожа як госпадзі! Цывілізацыя — чалавечае пакараньне. Сумна прызнаваць, але з-за матэрыяльных дабротаў губіцца душа чалавечая Душачыся ў гарадох забываемся на прыгажосьць, хараство І я такі самы

Я гляджу, — за шыбкаю зьмяняюцца чароўныя явы. І тут бы застаўся жыць, і тут. Слухаю адным вухам родную сваю гаворку, і дзівацкая ўсьмешка кладзецца на мае вусны. Добра ж як добра! І які д'ябал наслаў на гэтую зямлю калгасы адняўшы яе ў людзей хто змусіў дзяцей іхніх «зачігірікаць»? Шчасьлівы чалавек не заўважае свайго шчасьця. Толькі згубіўшы пачынае разумець што меў і што страціў.

Вялікая, ледзь бачныя краі, лагчына, хавае ў сваім густым кустоўі цёмную рэчку І мэліярацыя не зачапіла, — думаю я, — не напаскудзіла. Жывуць сабе як і жылі. Хоць і ня так, вядома але бегма й не прыкмеціш

Зімою тут усё заносіць сьнегам Няма гэтых яркіх зіхоткіх колераў. Ёсьць толькі сьнег сутонлівае шэрае неба, размытыя абрысы ўсяго далёкага й поўная цішыня. Можа, толькі ваўкі, ледзь чутныя, выюць.

У такі час у студзені і памер Зязюля

У вырай трэ было ляцець Куды вочы глядзяць у вырай. Чаго ж ён усё-ткі памёр? Можа гішпанка ці тыфус?.. А куды ўцякаць? Усё вакол сваё І народ, і зямля Ашмянская, адкуль ён родам падобныя да гэтых людзей і мясьцінаў і не адрозьніш

У сябе жыў у сябе и памер

* * *

Мы прыяжджаем на пляц. Тут аўтобусная станцыя, крамкі, пыльныя местачковыя ліпы вакол пляцу й пасярэдзіне Бабулькі прадаюць яблыкі, а два дзяды каля штыкетніку канторы з аднае пляшкі пацягваюць віно Горача думаю я

«Добры дзень!» Адказалі, зь цікаўнасьцю пагля-даючы, маўляў, чаго гэта ён? Я патлумачыў: шукаю мейсца, дзе стаяў касьцёл. Ведаю ўжо, што разбурылі. Мне ахвотна падказалі, пашкрэбваючы сівую шчэць на чырвоных тварах, абцёршы перад тым вільготныя раты. Паказалі пустку на пляцы. «А дзе хавалі ксяндзоў?» «У касьцёле, у самым касьцёле». «І што ж?» — запытаўся я, ужо ведаючы, што «Узарвалі. Арнаты зь мерцьвякоў парасьцягвалі дзеці» «А які быў касьцёл?» Я ня ведаў што яшчэ можна спытаць. «Высокі такі», — адказаў адзін «Стары», — дадаў другі. «А могілкі каталіцкія ёсьць?» «Ёсьць» — паказалі мне на вуліцу ў самым канцы пляцу

На мейсцы касьцёлу засталіся адно меткі ад былых падмуркаў — зраўняныя зь зямлёю рады чырвонае цэглы. І не будуюць тут мабыць таму што баяцца чарадзейнае сілы моцных падмуркаў

Рассыпалі твае костачкі, і сьледу не засталося — думаў я ходзячы па цагляных радах і прагаворваючы «Ойча наш». Не ў жыцьці, дык па сьмерці, — усё адно дасталі. Хай хоць цяпер моляць Бога каб ён даравў ім іхнія грахі.

* * *

Побач з касьцелам якога няма стаіць абсаджаны з усіх бакоў спарудкамі ды прыбудоўкамі кавалак былога кляштару

«Езус пахвалёны» — пасьміхнуўся я другому паверху, беламу й чыстаму наўзьдзіў, з акуратнымі баракальнымі гзымсамі. Першага паверху за розннай драбязою амаль не відаць. Па ахламонску выглядае бляшаны у рудых плямах дах. Адно другі паверх трохі суцяшаў супакойваў Напэўна, там хадзіў наш паэта, магчыма, спаў, Богу маліўся перад сном. У думках я прымацаваў паміж вокнамі пасярэдзіне бронзавы барэльеф зь Зязюлевым профілем і палез у чорную яміну з камунікацыямі, што вялі да кляштару. З тлустае зямлі выкалупнуў кавалак зялёнае кафлі ды глінянае донца чаркі — на памяць. Вылез і пайшоў туды, дзе бліскала сіняя вада

Пакуль ішоў, думаў, што, можа, жывыя яшчэ людзі, якія памятаюць паховіны «простага» ксяндза. Ішоў па грэблі. Празрыстая рэчка, дно відаць, бегла напрасткі да вялікай вады а я дабіраўся дарогаю Насустрач крочыла зь вязанкай боханаў за плячыма старая. Спытаў у яе пра каталікоў — ня ведае яна, хто застаўся І Зязюлю ня памятае. Сказала толькі, што касьцёл, перарабіўшы на царкву, былі адчынілі ў вайну а пасьля ізноў зачынілі.

Куды ж падзеліся каталікі? — падумаў я зварочваючы з грэблі па сьцежцы налева

Праз колькі мэтраў рэчка наблізілася да мяне і мы пайшлі разам у засені вербаў. І шкада, што ніхто ня кідае, ня сьмеціць, — глядзеў я на рэчачку-ручаіну калматую ад водарасьцяў.

Новая Культурная Сітуацыя

Сяргей Паўлоўскі

Фэномэн культуры нагадвае фэномэн хлеба. Гэта фэномэн нормы.

Але ці гэтага мы хацелі?

Прамаўляючы: колькі было, ёсьць і колькі будзе, — мы хацелі больш беларушчыны. Мы цешыліся кожнай зьбеларушчанай школе і грамадзкаму інстытуту, які пераходзіў на беларускую мову.

Гэта была ўся нацыянальная мара — беларуская Беларусь.

Цяпер жа найменшая канкрэтызацыя гэтае мары разводзіць нас у розныя бакі.

Прагматычная рэальнасьць мае свае законы будаваньня беларускае Беларусі.

Беларуская культура ня стане грамадзкай зьявай ад таго толькі, што ўсе школы й дзяржаўныя інстытуты будуць пераведзеныя на беларускую мову.

Рэч ня ў тым, што беларуская культура недасканалая ці недапасоўная, ці што народ цураецца свае культуры.

Рэч у тым, што школы й дзяржаўныя інстытуты — гэта толькі спадарожнікі культуры. Фэномэн жа культуры выяўляецца ў тым, што яна становіцца грамадзкай зьявай сама.

Нацыянальная культура — гэта зьява сьветапогляду нацыі, якая бярэцца зь яго, вяртаецца яму й прысвойваецца ім.

Не прысвойваецца не свая культура, альбо тое, што ня ёсьць культурай. Перш чым прысвоіць не сваю культуру, народу трэба было б прысвоіць чужы сьветапогляд.

Тое, што рабілася ў Расеі пасьля 17-га году — было спробаю свайго расейскага тыпу цывілізацыі і культуры.

Спроба беларускай савецкай культуры была арганічнай часткай гэтае спробы і як самакаштоўная зьява разглядацца ня можа.

У цэлым беларуская савецкая культура ня стала для беларускага народу сваёй, таму што будавалася на традыцыйным расейскім сьветапоглядзе. Пэўныя здабыткі ў галіне сацыяльных мэдытацыяў — гэта вяршыня культуры, якая ня стала сваёй.

Пэўныя эстэтычныя здабыткі проста не даходзілі да народу.

Пра тое, што беларуская культура сёньня ня ёсьць грамадзкай зьявай, найперш сьведчыць адсутнасьць у ёй калектыўных жанраў творчасьці: кіно, тэатру, TV...

Беларуская постсавецкая (найперш «адраджэнская») культура таксама не прысвойваецца, бо яе унутраны знак — мінус — застаўся ранейшы. Чаму?

Сутнасьць культуры (нацыянальны сьветапогляд) не выяўляецца ані ў лубочна манэрных скоках ды сьпевах сувэнірных ансамбляў, ані ў «крахах» ды «крызісах» мітынгоўцаў, ані ў «аптымістычных трагедыях» імітатараў публіцыстыкі, жывапісу, паэзіі... Калі яна й выяўляецца, дык у някідкай мудрасьці незапатрабаваных мысьляроў.

Можна знаходзіць у спадчыне, нацыянальным характары, у сабе розныя праявы самабытнасьці, але зь іх толькі сьцьвярджальныя становяцца культурай — самасьцьверджаньнем нацыі.

Невуцтва, паняволенасьць, кансэрватыўнасьць могуць быць адметнымі рысамі чалавека ці пэрсанажа, але ніколі яны не ставалі адзнакамі самабытнасьці нацыі.

Вызначэньне сьцьвярджальнага ў кожнай сітуацыі жыцьця патрабуе іншай адэкватнай праграмы.

Увогуле можна сказаць: «мы цёмныя, сьляпыя, быццам крот», «цябе залье крывіцкі рух», «падымайся зь нізін». Але ўсё гэта — самапрыніжэньне, прароцтва і заклік — аднамернае, як сьмерць.

Нацыянальнае адраджэньне ня стане дамінантай культуры (а культура — грамадзкай зьявай) пакуль яно аднамернае, як сьмерць.

Жыцьцё тчэцца з тысячаў рознакалёрных нітак.

Беларуская культура ня сьцьвердзіла сябе ў сьвеце, бо не сьцьвярджала, а адмаўляла.

Няшчасны, бедны, забіты, паняволены, цёмны, апатычны, зьнямоглы народ. У адмаўленьні былі знаходкі псыхалягізму, віртуёзнасьць стылю, тут спаборнічалі таленты.

Адмовіўшы, беларуская культура дзяжурнай фразай кліча свой адмоўлены народ падняцца. І падымаецца само адмаўленьне.

Няшчасны, цёмны і апатычны сам ніколі гэткім сябе не лічыў. Кожны думаў пра сваю надзею.

Паэтыка самаадмаўленьня дае сякія-такія пазыцыі, але толькі сякія-такія.

Слабыя пазыцыі адразу распадаюцца на апазыцыі, апазыцыі — у апазыцыі адна да аднае.

Потым некаторыя апазыцыі могуць зьмяніць знак «мінус» на знак «плюс». Для гэтага патрэбныя сродкі й пэўнае пашырэньне сьветапогляду, г.зн., гатоўнасьць зьмяніць знак.

Пра тое, што такой гатоўнасьці няма, сьведчыць перавага па-над усім антыпатыяў і характараў. Так настае час сварак. Эсэдэкі ня любяць бэнээфаўцаў адно таму, што яны эсэдэкі, і наадварот.

Толькі ў пашыраным сьветапоглядзе знаходзіцца мейсца сьцьвярджальнаму знаку, які адразу разрастаецца ў дамінанту. Усялякае адмаўленьне адыходзіць на пэрыфэрыю.

Кожны зьдзяйсьняе свой жыцьцёвы праект.

Жыцьцёвыя праекты кантактуюць у жыцьцёвых сітуацыях. Іх тло — краявід.


Беларуская культура не распрацоўвае жыцьцёвыя праекты і сітуацыі, яна ўжо не стварае самабытныя беларускія краявіды.

Тое, чаго ня робіць беларуская культура, — ёсьць нормай культуры, праз якую самасьцьвярджаюцца нацыянальны сьветапогляд і мова.

Свая культура — гэта здаровы прадукт, а ня мроя пра «далікатэс» ці галас пра «голад».

Мроі і галас — маргіналіі, апазыцыі. Яны будуць заўсёды, але на пэрыфэрыі здаровага прадукту фэномэн якога ў тым, што ён жыцьцёва неабходны, ён не прыядаецца й не выклікае гідлівасьць, яго ня трэба рэклямаваць, яму ня трэба вучыць. Ён засвойваецца штодня «сам».

Фэномэн культуры нагадвае фэномэн хлеба.



Здьмак Алень Адамчык

Блікі сонца ласкава кранаді яе ільсьняную паверхню. А прыгробся б сюды які бульдозер, зрабіў бы мэліярацыю — праз пальцы рэчачку можна было б прапусьціць, калі б зусім ня высахла. Не дабраліся яшчэ палескія мехкалёны да Віцебшчыны.

І вось адступілі вербы, скончыліся людзкія агароды, а рэчка саскочыла сабе ў сінюю роўнядзь і згубілася ў ёй. Далёка насупраць — другі бераг. Паміж невысокімі ўзгоркамі ляжыць ужо колькі тысяч гадоў сіняя лінза вады. Сьвежасьцю й вечнасьцю патыхнула на мяне. Вада, як і лес, ды яшчэ неба разам зь імі, падказваюць чалавеку ягонае мейсца ў гэтым сьвеце.

Мабыць, і ён прыходзіў сюды. Дзякаваў Богу за зямную прыгажосьць, стаяў у захапленьні, як зараз стаю я... Ад касьцёла, праз ручай, гэтым жа шляхам. Калі вядома ня быў ужо зусім хворы.

Я сеў на траву й глядзеў на гусей, што ярка-белымі плямамі рухаліся па беравым аксаміце на дзяцей, што калупаліся ў пяску на беразе каля перавернутага чаўна. Ластаўкі ціўкалі навокал, а над возерам нібы чысьці душы, лёталі белыя кірлі.

І яго я не найшоў у ксяндзы.

Файнае гэта мястэчка — Сянно.

* * *

Я пашыбаваў назад праз пляц разбураны касьцёл і кляштар, па вуліцы, якую паказалі мне дзяды. Нейкае спадзяваньне кволілася — а раптам гэты «просты» ксёндз захацеў легчы разам са сваімі парахвіянамі? Прайшоў каля ўлады й каля пошты, каля банку и каля крамы. Местачковыя хаты — гэта ня вёска. І дзьверы не туды, і кветак болей, і на падворку большы парадак.

Я цягнуўся па гарачым асфальце ды згадваў, як там Зязюля пісаў пра мястэчка. Ня ўздумаў ані радка. І толькі цяпер за сталом, выцягнуўшы змацаваныя сашчапкаю аркушыкі, знайшоў вершык, пра які думаў той парою ў Сяньне:

Цераз шлях пачтовы
Палыскнула рэчка...
Відны ўжо будовы
Роднага мястэчка.

Накрыж праляцелі
Вуліцы ў будынку
І касьцёл у белі
Нідалёка рынку

Чуточку ў аддалі
Цэрква, сынагога
Контуры ўказалі
І крыжы німнога

Там вучэльня-школа,
Почта лістовая,
Карчма ды стадола
Валасьці мейсца мае.

Вунь пакой прыёмны,
Фэльчар ды аптэка
Магазын —
склад скромны
Усялякіх лекаў.

Ля званіцы — брамы,
Ту-ж пры агароджы
У рад пасталі крамы
Сьцерагчы Дом Божы.

Журавы ад студні
Высунулі дзюбы
У дзень сьвяты ці будні
Говар тут нялюбы

Пояць быдло, коні
Абліваюць сьвіньні,
Скрып асьверу тоне
У гомані і гіне.

Цівкат верабеікі
Чуецца у прасторы,
Бытцам солад нейкі
Ля душы у горы

Міла пераехаць
Праз свае мястэчка.
Тут саломы вехаць
Маніць вабіць рэчка

У мясцовым стылю
Хаты збудаваны,
Іх з сабой злучылі
Густыя парканы

Мсніцца у воку
Места дарагое
І тужу здалёку
Неяк да яго я

Нясьпешнасьць і раўнавага. Вершык псыхічна здаровага чалавека, які любіць свой край і свой народ, і жыцьцё. Я думаю, што добра было б, каб вершы Зязюлі вучылі напамяць у школе.

Але вось вулка вывела мяне за мястэчка, скінула зь сябе гарачы асфальт і пацягнулася ружоваю сьцежкаю да нябачных паселішчаў. Зьлева ад мяне — яшчэ адно возера. Меншае за першае й не такое прыгожае. Побач нейкія сучасныя жоўтыя кар'еры, заліты асфальтам шлях і яшчэ штосьці, што не кладзецца адразу на вока. А справа ад гасьцінца на ўзгорку — зарослыя могілкі. Сюды я і йду.

Могілкі невялікія. А хавалі каталікоў з усіх ваколіц, пра што гавораць польскія надпісы на крыжах. Я хаджу ад аднае магілкі да другой. Учытваюся. У тутэйшым каталіцтве — частка культуры нашага народу. Не ўберажоная, аддадзеная хцівым заходнім суседзям. Для «братоў» і з захаду, і з усходу беларускі ксёндз быў страшнейшы за чуму. Мо' таму па вайне ў нас іх амаль і не засталося. Цкавалі адныя й другія. А тых, хто мог бы абараніць, не было.

* * *

Мне заўсёды цікава на старых могілках. Хоць падсьвядомае жаданьне ціснe душу — хутчэй бы пайсьці адсюль, дзе ляжаць мёртвымі столькі людзей. Магчыма, гэта толькі чалавечая ўласьцівасьць — усё хутка забываць. Прыродная легкадумнасьць дазваляе нам вось так бадзяцца па могілках. Мая маладая істота больш настроеная на разгляд старых каваных крыжоў, чым на думкі пра тых, хто ляжыць пад зямлёю. Праўда, часам мне становіцца непамысна, калі мушу таптацца па ледзь прыкметных капцах...

Крыж за крыжам, камені за каменем я перагледзеў старую частку могілак. Надпісу *АСТРАМОВІЧ* не знайшоў.

Я прылёг на высокім схіле кладзішча, між кустоўя, на дробным чабары. Рукі мае былі ў чабары, вочы глядзелі ў сіняе неба, а ў галаве круцілася: вось я ляжу тут, часова пакуль, побач з маімі землякамі. Якія яны былі людзі — благія, добрыя, любілі гэтую зямлю' ці не — іншая справа. Я задрамаў на імгненьне, яднаючыся зь імі і зь зямлёю. Нібы маё цела распусьцілася ў пяску і зьнікла. Толькі ясная, чыстая, не затлуменая мігатлівымі думкамі сьвядомасьць завісла ў цішыні...

Загула на дарозе машына й пабудзіла мяне. Час вяртацца і з могілак, і зь Сянна.

Калі-небудзь я усё ж убачу дошку з барэльефам Зязюлі на Сеньненскім кляштары.

З.К.

Чатыры вершы

* *

...мор, што падае нябёс,
...ўшчэнт у час сваго падзеньня
Ці трушчыцца у маўклівае каменьне
І траціць сілу, што з сабою нёс —

Так чалавек што хоча сваіх кроі
І мар убачыць хуткае зьдзяйсьненьне,
Ляціць да іх на ветразях натхненьня
І ўрэшце сустракае той жа лёс

Так ...авецтва ўсё: ліхі экспрэс
Нясе яго з разгонам у прагрэс,
Гараць у топцы дровы пакаленьні,
І ўжо няма як па ярнуць назад —
Туды дзе Дрэва і туды, дзе Сад,
І не спыніць чароўнага імгненьня.

* * *

Ці так даўно здаецца, бацяны
Дзіцё малое падарылі хаце,
А ўжо няма у таго дзіцяці маці,
І ўжо яно сівое, — ля труны

Ці так даўно, здаецца, сьвет зямны
Сваю маўклівасьць нежывую страціў,
А ўжо равуць паўсюль ліхія раці
І сеюць сьмерць у полымі вайны

Зямная куля кулян ...оніць
Даводзіць да лягічнага канца
Закон прыроды жорсткі недарэчны

Які паслаў нам лёс, як знак біяды
Усё жывое — гіне назаўжды,
І толькі нежывое жыцьме вечна

Ваўкі і авечкі

Вые воўк галодны З пушчы
Пара прэ у паветра Сьвішча
Ў голым гольлі вецер Пушча
Ўночы сажай крые сьнег.

Ветах скрозь вяходзіць хмараў
Срэбра лье ваўку на шкуру
Бяжа воўну з поўсьці зьвера
Ты чуваць сабачы брэх

Зьвер стаіўся недзе блізка,
У хмызах залёг на ўзьлеску,
І застыла у страху вёска,
У кашарах ціхі енк

Гаспадар бярэ набоі,
Ён авечак абароніць,
Воўк нічога ім ня зробіць
Іх пасьвіць чалавек

Койданаўцы

(Працяг са старонкі 1)

ажэніцца Алесь, зробяць прыбудову з асобным уваходам, а на той час згубіцца ў хаце было проста немагчыма Міля з Алесем не на жарт спалохаліся Быў бацька, тупаў-тупаў па хаце — і раптам ня стала Гэта ж ня кот, што зашыецца за шафу, і ты шукай не шукай, а ня знойдзеш, пакуль сам на малако ня выйдзе. І не вавёрка, якую трымала Іванава суседка цётка Косьця Вавёрка была надзіва шкадлівая

Аднаго разу, зьвечара, Косьця выбрала кошык яблыкаў, каб нараніцу завезьці прадаць Яблыкі выбірала круглейшыя, сакаўныя, без чарваточынак. А ўначы вавёрка ўзяла йараскідала іх па ўсёй хаце І каб жа толькі параскідала, а то ж яшчэ й панадкусвала кожны яблык Раніцай Косьця зьбірала яблыкі й кляла сваю вавёрку А тая, стаіўшыся за абразом, цікавала Вавёрку Косьця набіла венікам

Але тое вавёрка А дзе ж падзеўся Іван?

Маці з сынам абшукалі ўсю хату, пакуль Алесь не здагадаўся зазірнуць у вузкую шчыліну пад канапаю. Там ён і ўбачыў бацькавы ногі. Непаразуменьне прайшло толькі тады, як выцягнулі бацьку на сярэдзіну пакоя, а за ім дасталі з-пад канапы пусты слоік, што патыхаў самагонкай Іван любіў выпіць, а Міля не давала Тады й была прыдумана ды абсталявана схованка Пакуль усе глядзелі тэлевізар, Іван ішоў сабе ў залю, залазіў пад канапу і праз гумовы шланг ад пульвілізатара высмоктваў са слоіка грамаў са сто. Але на той раз доза атрымалася большая і ён сам не заўважыў, як заснуў Дый старасьць надыходзіла, сілы ня тыя

Вось у маладосьці, Іван сам казаў, мог выпіць вядро Асабліва шмат давялося выпіць, калі служыў у ахове Мас коўскага крамля Грошай ахоўнікам амаль не давалі, але добра кармілі й налівалі, колькі захочаш І хлопцы, маладыя, здаровыя, пілі

Пра НКВД Іван гаварыць не любіў. А ніхто, зрэшты, тады й не цікавіўся у Койданаве тым НКВД Усе ж недзе служылі, недзе ваявалі

Гэта цяпер, калі я буду праходзіць паўз Іванаў сад, а Алесь будзе закладаць падмурак пад гараж мы загаворым пра Дзяржынскага, у гонар якога й пераназвалі Койданава у 1933 годзе Зрэшты, і Койданава не першапачатковы назоў гарадка, раней яго называлі Крутагор'е. Мы загаворым пра НКВД, і Алесь скажа

— Шкада, бацька памер, а то паказаў бы яму газэты, дзе пра НКВД пішуць і пра Дзяржынскага Цікава, што б ён на гэта сказаў?

Іван Кубло памер раней, чым беларускія газэты пачалі друкаваць матэрыялы пра масавыя забойствы

Апошні раз я сустрэў Івана каля весьнічак Ішоў паўз ягоны двор, а ён якраз выходзіў на вуліцу ў сваім чорным скураным палітоне, шыракаполым капелюшы й наваксаваных да мэталёвага бляску хромавых ботах Пад пахаю ён сьціскаў вялікі папяровы пакунак

— Што гэта ў Вас пад пахаю, дзядзька Іван? — замест прывітаньня спытаў я

— Каміля паслала сала прадаць

— А ці добрае сала?

— Ты што, ня бачыш? — дзядзька закрыўдаваў — На чатыры пальцы Калі добра прадасца, дык і бутэльку сабе куплю

Гэта апошняе, што я пачуў ад Івана, які ўсё ж добра гульнуў на вясельлі Казікавай Гэлі.

Але спачатку ён ляжаў на канапе і ўдаваў, нібыта сьпіць Міля й Алесь стаялі пасярод хаты й ніяк не маглі зразумець, што ж такое здарылася, пакуль Алесь не спытаў

— Тата, а чаму гэта Вы босы?

— Таму што шкарпэтка згубілася, — Іван адказаў, але вачэй не расплюшчыў

— І з-за такой драбязы ўвесь гвалт? А Божачкі вы мае ды знойдзем зараз тваю шкарпэтку — Міля адчыніла шафу й пачала перарасаць у шуф лядзе з панчохамі

— Няма там, — Іван спусьціў ногі з канапы. — Я ўжо два разы ўсю шафу перамацаў

— А можа раней дзе згубілася? Можа маці, калі мыла, дзе на двары пакінула? — разважаў Алесь

— Ды ў тым і рэч, што абедзьве у руках трымаў, адну я надзеў, а другую як той чорт схапіў, — Іван мо ўжо трэйці раз зірнуў пад канапу, але, акрамя свайго гальштука, нічога ня ўбачыў.

Алесь зьняў валікі з канапы, але дарэмна Міля прынесла венік ды выграбла ўвесь пыл з-пад буфэту, шафы і ложка, але ўсё дарма Алесь разабраў ложак, а калі засьцілаў, мармытаў праклёны Шукалі доўга, шукалі паўсюль, нават зазірнулі у кубелец з салам Сям'я Кубло ўвайшла у пошукавы азарт: адчыняліся й зачыняліся, а потым зноў адчыняліся шафы, буфэт, стол, сэрвант, сьцягваліся й сьцяліліся абрусы й покрывы, вываросчваліся кішэні пінжакоў, жакетаў, портак і палітонаў, перастаўляўся абутак.

Раптам вялікі кутні гадзіньнік з латунным цыфэрблятам і вялікімі, на ланцужках, гірамі заскрыгатаў і ўдарыў — вясельле пачалося

— Бацька, ды надзеньце Вы другія шкарпэткі, — Алесь нібыта сасну прахапіўся з пошукавага азарту. — Вунь іх у шафе поўная шуфляда, выбірайце, і пайшлі.

Іван выбраў пару новых, яшчэ з круглым папяровым цэтлікам, шкарпэтак, сеў на зэдлік і пачаў сьцягваць праклятую пасястую, з-за якой пачаўся ўвесь тарарам. Тут усе і зразумелі, дзе падзелася другая Іван надзеў дзьве шкарпэткі на адну нагу

Сьмяяліся доўга Сьмяяліся Міля Алесь і Іван Сьмяялася ўсё вясельле, калі людзі даведаліся, з-за чаго спазьніліся Кубло Сьмяюся і я І адзінае, пра што мне хацелася ведаць і разумею, што ніколі не даведаюся што думаў Іван, калі надзяваў дзьве шкарпэткі на адну нагу?

Тоня

Тоня хварэла усе свае доўгае жыцьцё на чыста беларускія хваробы мігявасьць, агульную слабасьць нямогласьць і каўтун. Хрэстаматыйны каўтун убіўся ў Тоніны валасы яшчэ ў мінулым стагодзьдзі і недзе на самым пачатку нашага сынішоў. Але ўспаміны аб ім прайшлі праз усе Тоніны размовы з койданаўскімі лекарамі

— Дзетачкі вы мае, — пачынала яна сваё доўгае апавяданьне ў бальнічным кабінэце — У мяне ж каўтун быў. З таго часу й баліць галава не дакранушча І сьвет у вачох плыве крушцца, усё вакол як туманам засланяе І слабкасьць, і рукі дрыжаць, нічога рабіць не магу Увесь час на сон хіліць Так бы, здаецца і не прачыналася зусім

Лекараў на сваім вяку Тоня перабачыла безьліч І ні адзін зь іх ніколі нават не засумняваўся ў сапраўднасьці хваробаў і у шчырасьці скаргаў. А скаргі ціха плылі, як шырокая рэчка праз балота, закалыхвалі і пераконвалі... Пэўна, лекару было вельмі цікава слухаць тую сумную элегію

Шкада, што не знайшлося на Беларусі фальклярыстаў — аматараў пазанатоўваць жаночыя скаргі на ўласнае здароўе Менавіта жаночыя бо у мужчын яны каструбаватыя, неразгорнутыя, абсечаныя

— Во!!! Палец цыркуляркаю адхапіла

— Курыў, а вугельчык вазьмі ды ў вока пырсьні

— Хварэю, учора перапіў

А у жанчын зусім інакш, у іх плаўна, зь інтрыгаю, з накатам, з кульмінацыяй Яны так па-майстэрску складаюць свае апавяданьні, што лекар не заўважае, як робіцца сааўтарам і прагаворвае разьвязку, ставіць кроп ку — выдае такую патрэбную і доўгачаканую даведку на вызваленьне ад працы

У Тоніных скаргах кульмінацыямі былі раптоўныя страты прытомнасьці і падзеньні

— Я ж да Вас і не пайшла б ніколі, і ня стала б турбаваць, але баюся... Вось учора раніцай устала з ложка Ледзь жа устала, ледзь прачнулася Зрабіла два крокі і ня помню, што адбылося, што са мной здарылася Адно чую голас у цемры. Вочы расплюшчваю — Камілька стаіць перапалоханая Схілілася нада мною, а у вачох — жах Добры чалавек Камілька, я ў яе цяпер жыву на кватэры Яна дапамагла ўстаць і сказала. «Што ж гэты Вы, цётачка, сябе зусім не шкадуеце, не глядзіце? Вось ужо і падаеце на падлогу без прытомнасьці, а да лекара ня сходзіце ніяк». Таму я й сабралася, і прыйшла сюды.

Твар у Тоні мучніста-белы, нібыта вылеплены зь цеста а зморшчынкі на ім тонкія і глыбокія Вочы бясколерныя, вадзяністыя, з драбнюткімі, што льняныя зярняткі, зрэнкамі. І таму, калі глядзіш на Тоню, само сабою ўзьнікае жаданьне засунуць яе галаву ў печ, каб твар набыў цёплы чалавечы румянец, а не патыхаў халаднаватай мярцьвянасьцю, за якую лекары выдавалі самыя каштоўныя даведкі.

Даведак у Тоні назьбіралася безьліч Яна гадзінамі перабірала, вывучала перачытвала гэты адзіны свой сапраўдны скарб Паперы трымаліся ў глыбокай кардоннай пушцы з-пад зэфіру ў шакалядзе. У такіх ружова залацістых з выціснутымі кветкамі на накрыўках пушках дзяўчынкі заўвычай складаюць віншавальныя паштоўкі з ружамі, цукерачныя абгорткі й фатку, шаўковыя стужкі н зусім маленечкіх лялек Але ў Тонінм далёкім дзяцінстве не было гэткіх цацак, і яна на старасьці гадоў гуляла у дзявочую папяровую гульню на поўным сур'езе. Гуляла і выйграла аднапакаёвую кватэру на першым паверсе цагляната дома у самым цэнтры Койданава

Формула 6

6
у чорным доме зь нізкім дахам
між сьцен парослых шэрым мохам
мярцьвяк што разьвітаўся з дыхам
цяпер разьвітваецца з духам
тои доч апанаваны ліхам
і сьмерць у ім маўчаньню рэхам

5
на дрэве яблык гнілы сьпее
пад дрэвам раб яго чакае
нібыта воўк галодны вые
а з дрэва крук за ім цікуе
о гора вечнае людзкое

[illegible] але замест трона
стаіць адкрытая труна
народ вітае сьмерць тырана
штыгам вольная арэна

3
у летнім садзе ўсе прыгожа
гарыць пунсовай фарбай ружа
нажом яе садоўнік зрэжа

2
праз вакно дзяржаўнаи дачы
у сьвет глядзяць стальныя вочы

1
народ галодны шчэрыць рот

У свае сто чатыры гады Тоня нарэшце перабралася з прыватнай кватэры ва ўласную Усе казалі, што ёй пашан цавала, але я не хацеў бы сто чатыры гады пражыць у падсуседзях А у Тоні якраз такі лёс — жыць у людзей і нідзе не працаваць ніводнага дня, бо яшчэ на самым пачатку нашага ста годзьдзя высьветлілася, што падымаць больш за кілаграм ёй нельга, нахіляцца няможна, хутка хадзіць, а тым больш бегаць нявартa а займацца карысная разумовай дзейнасьцю увогуле забараняецца Апошні пункт у гэтым пераліку Тоня парушыла, але парушыла несьвядома, бо свае паэтычныя скарбі яны не лічыла за работу А я дык якраз бачыў у Тоні таленавітую паэтку якая ні чым іншым як паэзіяй адпрацоўвала самы мінімум патрэбнага ў гэтым жыцьці

Тоніна паэзія мела яшчэ адну выразную рысу — рэлігійна містычную Ва ўсіх яе апавяданьнях пра хваробы зіхацелі словы і выразы накшталт: даруй Божа, а Божачка ты наш хай Бог дапаможа. А пры Тоніным ложку, дзе б яна ні жыла, заўсёды на тумбацы, на падваконьні ці проста на крэсьле стаялі маленькія каталіцкія абразы Пры бясконцых пераездах-пераходах з хаты у хату яны складаліся ў пушку для даведак

А пераходаў за сто чатыры гады было столькі, што и сама Тоня не палічыць

Вось у некага са знаемых сына забралі у войска вызваліўся пакой, зь якога на гаспадароў пачынае павяваць халоднай проймаю страты І яны не знаходзяць нічога лепшага як запрасіць пажыць у іх Тоню Ці ў каго іншага дачка выйшла замуж і зьехала з Койданава у Менск ці куды далей. І зноў жа мейсца прапаноўвалася Тоні

Так вось пасялілася яна у Мілі Кубло, калі Алеся забралі служыць у Егіпце А у цёткі Косьці Тоня жыла пасьля таго, як Ада выйшла за вайскоўца і зьехала зь ім у Нямеччыну ажно на пяць гадоў. У цёткі Пэлі Тоня пражыла гадоу сем, бо даводзілася роднай сястрои Пэлінаму мужу Ясечку які, дарэчы, быў старэйшы за Тоню и пражыў пад Койданаўскім небам сто тры гады

Я нікоі ня чуў, каб Тоня скардзілася каму на лёс. Яна скардзілася толькі на хваробы. Можа яна скардзілася и на што іншае пад час споведзі рубяжэвіцкім ксяндзам Але пра тое ведае адзін Бог, бо старыя ксяндзы памерлі, а да новага, маладога, Тоня ня сьв'здзіць. А раней жа разы са два на год яна выбіралася да кась цёлу. Адкуль прывозіўся й ставіўся каля ложка новенькі яркі абразок Звычайна — Маці Божая Дзева Марыя зь белым тварам і складзенымі на грудзях рукамі такімі ж белымі и чыстымі, як і твар У Тоні рукі таксама былі чыстыя й белыя, бо ня ведалі ні зямлі ні пральнаи дошкі, ні бруднага завэдзганага тлушчам посуду

Тоня жыве 1 сто пяты год бачыць маціцовае койданаўскае неба.

Вінак

Вінак вырошчвау памідоры У Койданаве кожная сям'я нешта садзіла и нешта зьбірала Памідорамі нікога ня зьдзівіш Але памідоры Вінака Шавуры адрозьніваліся ад усіх астатніх у мястэчку як сонца ад месяца

Гаспадыні купляли у яго насеньне, распытвалі, як і што рабіць, у які дзень высаджваць і калі паліваць Тольки, як яны не стараліся а прыходзіў час — і самыя-самыя памідоры вырасталі у Вінакавым агародзе

Не скажу, што у астатніх былі кепскія, і калі іх вывозілі на менскія рынкі дык на прылаўках яны глядзеліся як мае быць і прадаваліся выдатна А вось Вінаку й вывозіць не было чаго, усё Койданава прыходзіла купляць да яго

Навошта купляць калі свае пад бокам? Два крокі ад ганку ступіў, пахадзіў па градах, навыбірау сьпялейшых ці, калі любіце, і цьвярдзейшых, намыў, нарэзаў, накрышыу цыбулі пасаліў, напярчыу, кропу кінуў, заправіў алеем ці калі хочаце, сьмятанаю і стауце на стол. Бярыце, частуйцеся, госьці дарагія Усё так але

Як гавораць у Парыжы «жакет ад Кардэна», так у Койданаве казалі «памідоры ад Шавуры». І можаце ня верыць Адно скажу што Вінак быў не такі просты як выглядаў з твару.

Выглядау Шавура будзённа и шэра Сівы, загарэлы па-сялянску, у старым пінжаку, надзетым на майку На гавіцы ў зямлі. Галёшы на босых нагах І ўся будзённасьць і някідкасьць



кампэнсавалася тварам. Гэта жарт, што Вінак меў просты твар. Калі каму цікава тык можна знайсьці ў Беларускай Энцыкляпэдыі кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС з 1968 году Шавуру Гэта вядома, ня койданаўскі агароднік, але твар вельмі падобны Вінак калі б на яго надзець белую кашулю і ўзяць пад гальштук, быў бы рыхтык кандыдат і вядома чаму — родныя брыты

Раней на розныя камуністычныя сьвяты на аскетычных фасадах урадавых пабудоў, акрамя чырвона-белых лёзунгаў і сьцягоў, вывешваліся манумэнтальныя палотны з тварамі Энгельса, Леніна, Маркса і ўсіх жывых членаў і кандыдатаў у члены Палітбюро ЦК КПСС. Жывыя (ўсе, як адзін) былі намаляваныя ў цёмных пінжаках белых кашулях і пад гальштукам

Сярод вохрыстых фатаграфічна-дакумэнтальных лікаў я заўсёды адшукваў койданаўскага земляроба і з гонарам адзначаў сваю далучанасьць да вельмі далёкай і вялікай справы

Сваяцтва Вінака Шавуры не магло не абрасьці ў гарадку рознымі байкамі й казалі як у гародзе — колькі ні палі ні касіце, а крапіва куток свой знойдзе І чаго толькі не плялі доўгія языкі!

Гандлярка Стэфа з крамы «Садавіна і гародніна» казала, што яе муж Волесь на ўласныя вочы бачыу, як Вінак закопваў на сваіх градах бляшанкі з золатам якія яму на «чайцы» прывозіў родны маскоўскі брат

— Ен таму и ня ходзіць нікуды са свайго двара ды поркаецца дзень і ноч на гародзе, — нашэптвала Стэфа даверлівым старым цёткам, — Юзэфе з Канстанцыяй. — І памідоры садзіць каб замаскавацца А сам крамлёўскае золата пільнуе

Стэфу ўсе разумелі бо Вінак адных памідораў прадаваў больш, чым яна ўсёй сваёй дзяржаўнай садавіны разам з гароднінай. Плян у Стэфчынай краме трымаўся толькі на тым, што на прыканцы месяца ёй прывозілі дзесятак скрынак зь «Вермутам» па сто дваццаць дзьве капейкі А якія у крамах памідоры, усе й так ведаюць

(Працяг на старонцы 6)

Лісты пра сучасную літаратуру

Францішак Эн.

2

Бось ш з падышоў гэ галоўнага (?)

Усе нашыя размовы пра літаратуру застаюцца адно прыватнымі меркаваньнямі альбо цэхавымі прыхільнасьцямі, калі мы не выходзім за межы самое літаратуры й не зьвяртаемся да рэчаў фундамэнтальных і пачатковых. Беларускае літаратуразнаўства надта доўга знаходзілася ў палоне «крывава сур'ёзнага»* эмпірызму, калі на працягу незьлічоных старонак людзі высьвятляюць, што ўсё ж такі хацеў сказаць аўтар. Інтэлектуальныя арыенціры гэтай навукі выразна сфармуляваныя ў кнізе «Уводзіны ў літаратуразнаўства. Хрэстаматыя» (Менск, 1991 (!) г.): Маркс, Энгельс, Бялінскі... «выказваньні беларускіх пісьменьнікаў пра літаратуру». Для паўнаты канцэпцыі не хапае толькі Чапаева.

На такім інтэлектуальным тле зьяўленьне новае генэрацыі — «Майстроўня», «Бабілён», «Тутэйшыя» — было ўспрынятае як літаратурнае хуліганства, што патрабуе ў большай ступені адміністрацыйных захадаў, чым культурнае рэфлексіі. Беларускія крытыкі падзяліліся на тых, хто «нападаў» і тых, хто «абараняў». Але ніхто ня ставіў за мэту РАЗУМЕНЬНЕ.

Зразумець — гэта значыць, усьвядоміць нешта як магчымасьць свайго ўласнага мысьленьня (жыцьця, сну, сьмерці)

Вядома, гэтая генэрацыя была для традыцыйна-савецкай беларушчыны генэрацыяй НЕМАГЧЫМАЙ. Зразумець яе было тым больш цяжка, што адныя й тыя людзі выглядалі (і былі) адначасова нацыяналістамі й касмапалітамі, гарадзкімі авангардыстамі й аматарамі фальклёру, пасынкаванымі «нефармаламі» й гульцамі ў шкляныя пацеркі

Ці можам мы казаць пра нешта агульнае, што лучыла б гэтых людзей у супольнасьць?

Першае, што выглядае на такое агульнае — усе яны «знайшліся ў беларускасьці». Але самая гэтая фраза ёсьць толькі знак пэўнага досьведу, які ў сваю чаргу мусіць быць расшыфраваны. Сапраўды: што значыць «знайшліся»? Што ёсьць беларускасьць?

Пытаньні выглядаюць наіўнымі, ды задаваць «наіўныя пытаньні» — ці не найбольшая сьмеласьць думкі. Тут трэба адкінуць «працэдуры мысьленьня» й тэрміналягічны апарат — і проста думаць. Гэтае «проста» — ня ёсьць нешта спрошчанае, у параўнаньні з чым «прафэсыйнае мысьленьне»** выступае як складанае. Проста — гэта значыць, напрасткі — да сутнасьці

«Знайсьціся» — гэта зусім ня тое што «знайсьці». Знайсьці можна пэўную рэч альбо ідэю. Знайсьці можна шлях

Знайсьціся ж — гэта значыць, знайсьці самых сябе. Але мы самі ніколі ня дадзеныя сабе як наяўнае, як аб'ект. Мы знаходзім сябе калі пачынаем углядацца ўсярэдзіну. На мове філязофіі такое ўгляданьне завецца рэфлексіяй

Гэта тое, што распавядае нам сама мова. Пра ўсё гэта можна сказаць па-іншаму

Недзе на мяжы васьмідзесятых пачала фармавацца генэрацыя, якая балюча адчула ўсю прывіднасьць імпэрскіх лябірынтаў, дзе ўсе разам былі згубленыя... Здавалася, адзіная сапраўды «рэальная» рэальнасьць — гэта канвульсіі Вялікага Савецкага Міту, татальнага міту, якога перамолвала ўсё — філязофію, мастацтва, жыцьцё. Усе былі роўныя ў рабстве, бяздомнасьці й сіротстве. З гэтай роўнасьці кожны знаходзіў ся паасобку

Беларушчына зьявілася гэтым людзям як патаемная духоўная сутнасьць, што нас лучыць, як салодкае духоўнае ядро, як лёс, як «ціхая ўлада магчымасьцяў». Беларушчына праменілася з будучыні

Сама «тутэйшасьць» выглядала як прастора чыстай магчымасьці, як асаблівая сэнсаўтваральная сфэра, якая, «ня маючы нічога», тым ня менш здольная умясьціць усе. У эпоху нігілізму, у час адчужанасьці сацыяльных культурных рытуалаў «тутэйшасьць» ёсьць вымярэньне надзвычайнай інтымнасьці, «свойскасьці» культуры й жыцьця.

«Тутэйшасьць» — гэта не ідэя й не псіхалягічная асаблівасьць беларусаў. Яна ня мае анічога агульнага з размазанасьцю вясковага досьведу на бясконцых «трылёгіях» беларускай савецкай літаратуры. «Тутэйшасьць» — своеасаблівы ахоўны інстынкт беларушчыны, разуменьне таго, што нават калі мы запоўненыя «чужым» — гэтае чужое ня можа натуральна вырастаць з традыцыі. У гэтым выпадку нам застаецца чыстая прастора — «тутэйшасьць»

Гэты мэтафізычны досьвед ці ня самае каштоўнае ў генэрацыі «тутэйшых».

Сёньня, калі Беларускае адраджэньне ўсё больш прафэсіяналізуецца, асабліва відавочна, што ўзровень калектыўнага міту не зьяўляецца тым падмуркам, на якім можа існаваць і разьвівацца культура (нават калі гэты міт — беларускі). Падмацоўчы падмурак — гэта сама думка рэфлексія.

Рэч ня ў тым каб Вялікае княства перавесьці зь Літоўскага у Беларуска-літоўскае альбо ў Беларускае, а ў тым, каб яго зрабіць «сваім» «тутэйшым», каб чалавек успрымаў яго ў модусе інтымнай далучанасьці да традыцыі, а сябе ўспрымаў працягам гэтае традыцыі. Не пераход ад адной наяўнасьці да іншай, а такое размыканьне прасторы беларушчыны, каб мы маглі сказаць: беларускасьць — гэта свабода

Толькі тады, калі мы самім сабе можам сказаць што Беларусь — гэта свабода, мы будзем мець правы ўголас дадаць:

А будучыня — гэта Беларусь

Заўвагі аўтара

* Вызначэньне Яна Максімюка, перакладчыка «Уліса». Насуперак гэтай «крывавай сур'ёзнасьці» савецкае беларушчыны ён распавёў гісторыю перакладу Джойсавага твору, што выглядае культуралягічным апокрыфам, але ад гэтага не губляе сваёй цікавасьці. Самая ідэя перакласьці «Уліса» зьявілася ў славутага беластаччука пасьля гадавога (?) знаходжаньня ў польскім войску. Жылося яму кепска. Жыцьцё яго ня радавала. Часам здавалася, што ён — толькі сон, які сьніць Ярузэльскі (варыянт Пілсудзкі). Пачуцьце абсурду ўзмацнілася ў першы дзень цывільнага жыцьця. Менавіта у гэты дзень былі перакладзеныя першыя старонкі «Уліса»... Ergo sum

** Думка ня мусіць быць прафэсыйнай. Яна мусіць быць істотнай

Койданаўцы

(Праця. са старонкі 5)

А вось калі цётка Пэтя параўнала свае памідоры зь Вінакавымі, дык у яе нарадзілася думка, што Вінакаў брат прысылае ў Койданава амэрыканскае насеньне, бо толькі з амэрыканскіх зярнятак могуць вырастаць такія смачныя памідоры. Пэтя пераканала сябе й спрабавала запэўніць іншых, што Шавура ўсім прадае гэтно насеньне, а сам садзіць другое.

Да таго дашло, што Казікаву Гэлю паслалі на пошту даведацца, ці не атрымлівае часам Вінак пакункаў з Амэрыкі? Гэля праз былую аднакласьніцу даведалася, што ніякіх пасылак з ЗША і Канады ў Койданава за апошні год не прыходзіла, а Вінак атрымлівае толькі часопісы па садаводзтву й маскоўскую газэту «Праўда»

Цётку Пэлю такія зьвесткі не пераканалі:

— Ну і што? Калі не па пошце прыслаў, значыць, на машыне прывез!

Пярэчыць было бессэнсоўна

Доўгая чорна блескавічная машына разы са два на год спынялася каля нефарбаванай Вінакавай брамы. Зь яе выскокваў, як чорцік з партабакі, увішны шафер з тонкімі кэгэбісцкімі вусікамі. Адчыняліся другія дзьверцы, і на койданаўскую запыленую прыдарожную траву ступаў цьмяна-бліскучы вузкі чаравік Шавуры-малодшага.

Кандыдат у члены Палітбюро ЦК ішоў, высока ўзьняўшы паголенае падбародзьдзе, у брата ў хату, а за ім угінаючыся, бег, як ненавязаны цюцік, адданы шафер

Пра што гаварылі браты Шавуры? Ці бралі яны чарку? Ці даваў малодшы старэйшаму грошы? Койданава ня ведала.

Услужлівы шафер пакаваў у багажнік дзяржаўнае машыны скрынкі з памідорамі. Сьветлыя, з абгабляваных дошчачак, зграбныя невысокія скрыні Шавура-партыец прывозіў з сабою. Койданаўцы казалі, што ён возіць памідоры ў Маскоўскі крэмль каб частаваць Хрушчова, Брэжнева і ўсіх астатніх членаў Палітбюро ЦК КПСС. Сам ён столькі зьесьці ня мог, а вазіць памідоры на «чаицы», каб згнаць і выкінуць — глупства. Так што Шавура ўсё ж некага частаваў.

Пры ўсім сваім скептычным стаўленьні да ўраду, койданаўцы паважалі Шавуру-малодшага, бо разумелі — не было б яго, і не было б памідораў ад Шавуры-старэйшага. Бо хто б тады дазволіў Вінаку прадаваць свае таматы налева й направа?

Хто гэта ў канцы 60-х мог дараваць беларусу занятkі адасобленаи уласьніцкаи эканамічнай палітыкай? Хто б дазволіў яму садзіць памідоры й толькі памідоры калі ўсе астатнія садзяць бульбу, рэпу, капусту, моркву, буракі агуркі й бабы з гарохам? Ніхто!

А так вось былі ў Койданаве лепшыя на Беларусі памідоры. Я ва ўсялякім разе смачнейшых не каштаваў.

Баба Ядзя давала мне папяровы рубель, манетку ў дваццаць капеек і чысты не з-пад бульбы кошык



Што чытаюць у Менску?

Алесь Ас.

У № 3 НН ужо быў матэрыял пад такой назвай Што чытаюць у Менску? Людзі культуры й людзі палітыкі й проста цікавыя людзі й тыя хто мае непасрэднае дачыненьне да выданьня НН казалі пра тое што яны чытаюць Пасьля публікацыі я працягнуў сваё апытаньне

З народным дэпут **Валяньцінам Голубевым** мы ехалі у Салігорск на мітынг. Ён — выступаць я — распаўсюджваць *Свабоду* і *НН* І я спытау

— Сп Валяньцін, што Вы цяпер чытаеце?

А ён адказау

— Аповесьць Кастуся Акулы «Змагарныя дарогі» Уражаньне самае станоўчае. Там ясна паказана, што беларусы, якія пайшлі змагацца ў беларускае войска, аднолькава не прыймалі як бальшавікоў, так і фашыстаў Яны ставілі перада сабой тыя самыя мэты, што й БНР у 1918-м годзе вольная, незалежная Беларусь з усімі атрыбутамі дзяржаўнасьці, у тым ліку і з войскам

* * *

З выдаўцом **Паўлам Жуком** мы сядзелі у рэдакцыі *Свабоды*

— Прачытаў «Палёт над гняздом зязюлі» Кэна Кізі Адвальна

* * *

Ігар Бабкоу днямі вярнууся з Францыі

— Чытаю сваю памяць Не магу паверыць, ці сапраўды гэта я пару дзён таму шпацыраваў па Парыжы й піў на кожным рагу каву?

* * *

Алеся Разанава я выпадкова убачыу у кнігарні пісьменьніка

— Паглыбляюся ў тое, што калісьці ўжо чытаў Новы час, і новы ракурс зьяўляецца У кнігах бачыцца нешта іншае, што раней адыходзіла на другі плян Магчыма, нешта зьмянілася ў маім зроку, магчыма ў часе, але гэтыя рэчы бачацца па-новаму, больш глыбокім чытаньне стала А канкрэтна? Вяртаюся да папярэднікаў. Багушэвіч, Багдановіч, Купала, Цётка, Колас Я не кажу, што іх прачытаў Я іх чытаю

* * *

Зь **Янкам Брылем** мы размаулялі у фае Дома літаратараў.

— Чытаю Мантэня Раней толькі знаёміўся, а цяпер мне трохтомнік падаравалі Вельмі цікава Дый увогуле, магчыма, гэта ўзрост такі — стаміўся ад бэлетрыстыкі Чытаю ўспаміны Шаламава «Навамірскі дзёньнік» Кандратовіча (быў намесьнікам у Твардоўскага) З прэсы — Нашу Ніву Грамаду. ***Новае пакаленьне, шмат энэргіі Але нароўні са станоўчымі ёсьць і адмоўныя моманты Калі ўжо ўзяліся за справу, трэба цалкам адчуваць адказнасьць, як яе адчувалі Купала, Колас Луцкевічы Ластоўскі***

* * *

Алесь Камоцкі, перад прэзэнтацыяй *НН* на філфаку

— Чытаю дэтэктывы Проста чытаю, усё, што дзе знаходжу Ня памятаю ні назваў, ні аўтараў У мяне такі цяжкі год, што нічога іншага чытаць не магу

* * *

Мастак **Фэлікс Янушкевіч**

— Чытаю амаль усю пэрыёдыку Проста цікавы час зараз Але актыўнасьць зьмяншаецца, і месяцау праз 5-6 можна будзе зноў не чытаць прэсы А яшчэ ўпершыню сустрэўся з творамі Папы Рымскага Цікавы філёзаф, чытаецца прыемна Перакладаю ягоную кніжку «Мужчына и жанчына». Цудоўная польская мова моцна адрозьніваецца ад тае, да якои мы прызвычаіліся

* * *

Зь **Лявонам Вольскім** (Мроя) мы размаўлялі па тэлефоне


— Чытаю Шайбака з Клімковічам «Каханку д'ябла». Толькі пачаў А яшчэ «Тэатар парадоксу» — Бэкета Ёнэску Пра ўраженьні цяжка казаць, бо ведаю што чытаю

* * *

Зь **Віктарам Чаропкам** мы пілі гарбату з булкамі.

— Прачытаў Тэйлара «Першабытную культуру», Катлярэўскага «Пахавальныя абрады ў славянаў», Ігара Шафарэвіча «Сацыялізм як зьява сусьветнае гісторыі», Мар'яна Віжа «Лабірынт» Усё разам — урачыстае пахаваньне сацыялізму як зьаем беларускай гісторыі

Усе што небудзь чытаюць



— Папросіш Вінака, каб ён сам табе навыбіраў, — казала яна — Ён прапануе выбіраць, а ты скажаш, лепей Вы самі навыбірайце

У Вінакавай сьветлай хаце панаваў кіславата-салодкі востры памідорны водар На вокны ня вешаліся фіранкі, і сонца вялікімі ромбамі ляжала на падлозе У Вінака амаль не было мэблі, так — самае неабходнае — тожак стол, крэслы І паўсюль на разасланых газэтах у ромбах густога сьвятла і ў празрыстых блакітных ценях ляжалі, сьвяціліся сакаўной мякацьцю праз тонкую глянцавую скурку, чырванелі насьпелымі бакамі, зелянелі вострымі пупавінамі пладаножак, патыхалі летнім цяплом Шавуравы памідоры

— Выбірай, – казау гаспадар і працягваў узважваць на шалях што стаялі на падлозе каля дзьвярэй, памідоры для дзьвюх дзяўчынак. Яны былі старэйшыя за мяне і я іх ня ведаў. Пэўна, прыйшлі з другога канца Койданава ці зь вёскі, зь якіх-небудзь Макаўчыц ці з Бакінава

Вінак пазвоньваў дробнымі гіркамі, састаўляў іх па росту каля плінтуса

— Чаго не выбіраеш?

— Навыбірайце самі, калі ласка У мяне грошай на тры кіляграмы

І ён выбіраў і складаў на алюміневы сподак.

Падобныя да цацачных качак дзюбкі вагаў пачыналі скакаць, аж пакуль ніз дзе ляжалі памідоры не плыта ўніз. Шавура акуратна перасыпау памідоры ў мой кош

Нес я іх асьцярожна, гэта ж памідоры ад Шавуры

Пазьней, ужо у інстытуце, калі буду чытаць Басё, згадаецца Вінак. Вялікі японец па мянушцы Горкі Гарбуз сказаў вучням· «Хоку, і ніякіх іншых думак»

Так і ў Шавуры, не было іншых думак, акрамя салодкіх памідораў. Але у Вінака была мара

Аднойчы ён заішоў у нашу хату па нейкую драбязу Здаецца, дзед Броніс паабяцаў яму аддаць нашую старую спружыну на дзьверы. Не памятаю Толькі дзела не было Мы з бабай Ядзяй вячэралі. Вінак адмовіўся сесьці за стол. Стоячы ў парозе ён раптам сказаў што хоча кінуць памідоры, бо думае паспрабаваць вырошчваць вінаград але ніяк не зьбярэцца прадаць дом і пераехаць у Берасьцейскую вобласьць, бо там цяплей, чым у Койданаве Баба не адгаворвала Вінака Кожны чалавек павінен сам выбіраць куды ехаць і што садзіць на сваёй зямлі

Праз гады тры Вінак зьехау спачатку на Берасьцейшчыну, а далей і ў Малдавію Ці жыве ён там цяпер у Койданаве ня ведаюць

А для койданаўскіх памідорау насталі новыя часы часы цяпліцаў і парнікоу, але ці можна параўнаць тамат з-пад поліэтыленавай плёнкі з памідорам які рос і сьпеў на жывым сонцы?

А Г



Малюнкі Алега Аблажэя

Ордэн братоў-прапаведнікаў

Алег Дзярновіч

У мінулым нумары НН *мы пісалі пра тых, хто першы вырабіў лiквор «Бэнэдыктын» А цяпер — аповяд пра вынаходнікаў гульні ў даміно*



У 12-е стагодзьдзе рымскі касьцёл уступіў у росквіце сваёй магутнасьці. Была створаная сапраўдная тэакратычная манархія з магутнай агульнаэўрапэйскай фінансавай базай, судовай сістэмай, разгалінаванай дыпляматычнай службай Рымскія папы перамагалі нямецкіх імпэратараў, адлучалі ад касьцёлу каралёў францускага й ангельскага, накладалі на іхнія краіны інтэрдыкт У вызначальным уплыве на грамадзкае жыцьцё была моц касьцёла, але ў гэтым жа былі й перадумовы стагнацыі

Тым часам значна бюракратызаваныя структуры касьцёлу існавалі ўжо самі для сябе, душпастырства займала іх толькі дзеля фіскальнага інтарэсу Распаўсюджваньня ерасяў у 12-13 ст Аспрэчваючы асноўныя дагматы касьцёлу, альбігойцы, напрыклад, выпрацавалі досыць прывабную сацыяльную праграму, якая шмат у чым грунтавалася на ўраўняльніцкай псыхалёгіі

Спэкулюючы на азлабленасьці пляйбейскіх элемэнтаў, альбігойцы маглі ператварыцца ў значную дэструктыўную сілу Эўропы Колькасьць прыхільнікаў ерасі расла Папы арганізоўвалі крыжовыя паходы, жорстка караючы адступнікаў Але ў сфэры духоўнай гэтыя меры не маглі вы правіць сітуацыю, спыніць разлад Патрабавалася нейкае неардынарнае выйсьце Рух за абнаўленьне каталіцкага касьцёлу пачаў распаўсюджвацца сярод самых вернікаў, што выклікала рэформы й на арганізацыйным узроўні

Дамінік дэ Гусман (1170-1221) нашчадак знакамітага шляхецкага роду Гішпаніі, нарадзіўся у вельмі бурлівы для свае радзімы і ўвогуле для Эўропы час Зь пераменным посьпехам ішла Рэканкіста (вызваленьне ад маўраў Пірэнэйскай паўвыспы), у суседняй Паўднёвай Францыі пашыраўся ўплыў альбігойцаў. Час рабіў людзей больш дынамічнымі, а падзеі актуалізавалі пытаньні веры Хрысьціянства ж зьяўлялася для гішпанцаў сваёй самасьцю (узгадайма войны зь іншаверцамі). Але Дамінік быў чалавекам негвалтоўнага дзеяньня Прыклад гэтага — заснаваньне ім у 1206 г у Прулэ жаночага кляштару для перавернутых альбігойцаў

Адчуўшы схільнасьці прапаведніка, Дамінік стварае суполку па-багаслоўску падрыхтаваных місыянэраў, на падставе якой і засноўвае ў 1215 г Ордэн братоў-прапаведнікаў — Ordo Fratrum Praedicatorum, які часта называюць Дамініканскім.

Папярэднія кляштарныя законы былі прыстасаваныя да старой, пераважна аграрнай структуры фэадальнага грамадзтва Дамініканы ж ствараліся як ордэн вандроўны, а адмаўленьне ад уласнасьці было іх першым абавязкам Уводзіўся таксама цэлы шэраг пабытовых абмежаваньняў, напрыклад, дамініканы не ўжывалі мяса

Уласны прыклад шмат значыў для міран, і дамініканы пайшлі ў шмат людныя кварталы, пераходзячы з гораду ў горад Так, у адрозьненьне ад усходне-хрысьціянскага манаства, эўрапэйскія манахі ўсё больш адыходзілі ад сузіральнасьці, актыўна ўключаліся ў жыцьцё грамадзтва

І у наш край дамініканы патрапілі досыць рана Першым каталіцкім біскупам пры вялікім князі Міндоўгу быў дамініканскі манах Віт. Праўда, місія Віта была непрацяглая. Тым ня менш, тады ж (1250 г) дамініканскі кляштар быў заснаваны ў Любчы У 1320 г, пры вялікім князі Гэдыміне, кляштар перавялі ў Навагрудак

Цяпер і надалей дзейнасьць дамініканаў па ўсёй Эўропе была сканцэнтраваная пераважна ў гарадох Яшчэ ў 50-60-х гадох 13 ст генэрал ордэна Умбэр дэ Роман сфармуляваў тры фактары перавагі працы ў горадзе над працаю ў вёсцы 1 у горадзе казаньне найбольш эфэктыўнае з-за канцэнтрацыі у ім насельніцтва, 2 маральнасьць у гараджан ніжэй, чым у вяскоўцаў; 3 праз гараджан можна ўзьдзейнічаць і на вяскоўцаў, якія бяруць з гараджан прыклад

Дзеі ордэна ў Вялікім Княстве — яскравы прыклад ажыцьцяўленьня гэтых прынцыпаў Усяго ў Старабеларускай дзяржаве існавала каля 90 дамініканскіх кляштараў Большая частка іх была заснаваная ўжо у 17 стагодзьдзі і зьвязана гэта з Контррэфармацыяй. На Беларусі й Літве такія кляштары йснавалі, да прыкладу, у наступных местах

Вільня: Сьв. Духа і на Лукішках (заснаваныя адпаведна ў 1501 і 1642 гг.),
Менск (1615)
Дзярэчын (1618)
Шклоў (1619),
Рэчыца (1621),
Астравец (1622),
Смаленск (1622),
Горадня (1635),
Зэмбін (1640),
Віцебск (1642),
Ворша (1649),
Васілішкі (1659)
Беліца (1665)
Пінск (1666)
Ельня (1667),
Ашмяны (1667)
Полацак (1671)
Нясьвіж (1672),
Чашнікі (1674),
Мсьціслаў (1674)
Ула (1678),
Слонім (1680),
Берасьце (1680)
Дунілавічы (1682),
Клецк (1683),
Заслаўе (1684)
Княжыцы (1684)
Пяскі (1685),
Ракаў (1686),
Трокі (1688),
Багданаў (1691)
Друя (1697),
Ляхавічы (1700)
Ушачы (1716)

У 1647 годзе была ўтворана асобная літоўская правінцыя Сьвятога Анёла Ахоўніка

Ад пачатку дамініканы вялікую ўвагу надавалі прамоўніцкім здольнасьцям і тэалягічнай падрыхтоўцы. Зь цягам часу гэты ордэн кантраляваў практычна ўсе тэалягічныя катэдры ўнівэрсытэтаў Эўропы Дамініканы далі выбітных мысьляроў сярэднявечча Імёны толькі Альбэрта Вялікага й Тамаша Аквінскага красамоўна сьведчаць пра гэта

Альбэрт Вялікі (Albertus Magnus, 1206—1280) увёў у інтэлектуальны ўжытак усе працы Арыстоцеля (значны крок і для нашага часу) з уласнымі камэнтарамі. Сьцьвярджаючы стваранасьць матэрыі й часу, ён узаконіў у рамках схалястыкі арыстоцелеву фізыку зь яе вучэньнем пра непарыўнасьць матэрыі як асновы зьменаў

Тамаш Аквінскі (Thomas Aquinas, 1225 1274) у сваіх знакамітых «Суме філязофіі» й «Суме тэалёгіі» падвёў вынікі тэоляга-рацыяналістычных пошукаў схалястыкі. Культуру здаровага сэнсу, упарадкаваньне натуральнага розуму, над якім надбудоўваецца ярус звышнатуральнае догмы, Тамаш Аквінскі сьледам за Альбэртам Вялікім знайшоў у Арыстоцеля Доктар-дамініканін выводзіў быцьцё Бога з быцьця рэчаў. Сьв Тамаш разглядаў быцьцё як першае з актуальных становішчаў І ва ўсякай рэчы столькі быцьця, колькі ў ёй актуальнасьці. У сусьвеце сапраўды сутнасным у канечным выніку зьяўляецца індывідуум Гэткі пэрсаналізм уяўляе сабой спэцыфіку тамісцкай (ад імя стваральніка) анталёгіі Шырака выкарыстаўшы катэгарыяльны апарат Арыстоцеля, Сьв Тамаш даў такім чынам рацыянальнае абгрунтаваньне быцьця Бога У пазнаньні Бога — еднасьць Розуму й Веры

Тамізм не адразу, але прыймаецца касьцёлам у якасьці дактрыны (1314 год, Вьенскі сабор) У 16-м стагодзьдзі ен быў актыўна падтрыманы езуітамі Ужо ў нашым стагодзьдзі пазбавілі тамізм пэўнай статыкі Тэярд дэ Шардэн, К Ранэр, Г.Вэттэр... Папа Ян Павал II — вядомы нэатаміст

Пленнасьць працы ордэна відаць і з колькасных паказчыкаў у бібліятэцы Віленскага ўнівэрсытэту было да 300 кніг, напісаных дамініканамі Гэты ж ордэн непасрэдна ўплываў на адукацыю У нашым краі дамініканы стварылі павятовыя гімназіі ва Ўшачах, Нясьвіжы, Навагрудку (тут у 1808-1816 гг вучыўся Адам Міцкевіч) У Горадні дамініканы ўтрымоўвалі сьвецкую гімназію, пры якой існаваў прыродны музэй. А пры Віленскім кляштары дзейнічалі вышэйшая калегія і дамініканскі шпіталь. Місійны характар дзейнасьці адбіваўся і на моўнай палітыцы дамініканаў Пры кляштарах выкладаліся татарская і армянская мовы

У канцы 18 ст, калі пачалося фармаваньне сучаснай беларушчыны, у Забельскай дамініканскай калегіі (а вёска Забель Верхнядзьвінскага раёну — гэта й сёньня лясны край) у 1789 г вучні выканалі опэру «Апалён-заканадаўца, або Парнас рэфармаваны» Аўтарам опэры быў Міхал Цяцерскі, беларускі драматург, прафэсар рыторыкі й паэтыкі гэтай навучальнай установы, ен адзін зь першых пачаў уводзіць у творы беларускую мову Музыку да опэры напісаў вучоны-дамініканін Рафаэль Вярдоцкі Дарэчы, «Апалён-заканадаўца» цяпер адроджаны й мае досыць інтэнсыўнае тэатральнае жыцьцё

Як апраналіся дамініканы? Яны насілі белае адзеньне, у час казаньня і ў горадзе накідвалі чорны каптур

Дамініканскі ордэн на Беларусі й Літве быў скасаваны ў 1844 г Апошні дамініканін Вялікага Княства памёр у Вільні ў 1864 г. ў кляштары кармэлітаў пры касьцёле Ўсіх Сьвятых

Хто такія кармэліты? Пра гэта — іншым разам

Suslicus



«Вось сымбаль твой, забыты краю родны!»

На мяжы XIX—XX стагодзьдзяў у Новую Зэляндыю для паляваньня былі інтрадукаваныя ледзь ня ўсе віды аленяў з розных кантынэнтаў Зямлі. Ня маючы натуральных ворагаў, алені хутка распаўсюдзіліся й наносілі непапраўную шкоду рэліктавай флёры краю Але пры тым сёньня новазэляндцы маюць такое паляваньне, пра якое могуць толькі марыць паляўнічыя на Беларусі

Сусьлік — зусім не аб'ект для ловаў, ды й ніхто яго на Беларусь не завозіў. Косткі сусьліка вялікага (citellus major) былі выяўленыя пад час раскопак верхнепалеалітычнай стаянкі Бердыж у Чачэрскім раёне

Сеньня ж рабы сусьлік (citellus suslicus) — звычайны тубылец у Верхнім Панямоньні, на Случчыне, Капыльшчыне, Навагрудчыне... Вялікае шкоды ад яго няма, бо селіцца ен на непрыдатных і абложных землях, там, дзе есьць які пагорак ці насып Сілкуецца травой, дзікімі злакамі, а часам і казюркамі. Каб пад'есьці, сусьлік вылазіць пад вечар ці на сьвітаньні. Гэта вельмі палахлівы зьвярок Калі-нікалі можна бачыць, як ен сьмешна стаіць пушыстым слупком, бы вартавы ля свае норкі Пабачыўшы вас, першы дазорца сьвішча астатнім, і ўся калёнія вокамгненна зьнікае ў густым дзірване, хаваецца у норкі

Так яны й жывуць да верасьня, гойсаючы па сваім пагорку, назапашваюць тлушчу, каб пасьля спаць да вясны

Нягледзячы на вялікі веснавы прыплод (ад трох да 10 сусьлянятаў), іх колькасьць ня надта й павялічваецца, — з-за атруты, якую лье на свае палі чалавек, з-за ласых драпежнікау (каты, лісы, каршуны)

Гэты невялікі грызун (да 26 см з хвастом і каля 300 грамау вагі) мае жоўта-белую поўсьць на трыбушку і рудую, шэра-бурую ў белыя плямкі — на сьпіне, за што й быу празваны рабым

Наяўнасьць іх на Беларусі — парадокс для заагеографау, бо сусьлік, як і драхва (глядзі *НН* № 4), — клясычны прадстаўнік стэпавае фаўны У нас яны жывуць далёка па-за межамі асноўнага арэалу свайго віду утварыўшы сваю, аўтаномную беларускую папуляцыю.

Вось так

SH

Вільня у кант[illegible] [illegible] папулізму

Ка[illegible] палітычнае пытаньне [illegible] [illegible] новіцца «справаю усенароднай» і непазьбежна [illegible], набывае максімальна спрошчаную, кантрасную форму (толькі так або не), «ачышчаную» ад любых недапасоўных (у тым ліку й маральных) матывацыяў. Які-кольвек кампраміс прызнаецца немагчымым. А ў выніку заўсёды — дэструкцыя: народ вялікімі ахвярамі ніколі не дасягае свае мэты.

Гэтак ня выпрацавала й не заняло свае пазыцыі ў дачыненьні да Вільні й Віленшчыны кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь, і ўжо на нашых вачох гэтае пытаньне набывае «ўсенародны характар». Далучыць Вільню да РБ! Адабраць, вярнуць, не зважаючы ні на што.

Пытаньне імкліва «ачышчаецца», спрашчаецца. Сярод адкінутых за непатрэбнасьцю — ужо ня толькі кампраміс, але й такія аргуманты, як жыцьцё чалавека, лёс тысяч. Застаецца толькі: **вярнуць** або страціць. Прычым альтэрнатыва ва «ўсенароднай» палітыцы ніколі ня ўлічваецца. Хоць у выніку заўсёды рэалізуецца толькі яна.

11 студзеня *Звязда* надрукавала заяву 9-ці грамадзян, дзе пытаньне Вільні й Віленшчыны ставіцца якраз у такой спрошчанай, папулісцкай форме.

Галоўныя пастуляты заявы: Вільню й Віленшчыну трэба далучыць да РБ, таму што: спрадвеку тут жыла большасьць беларусаў. Вільню адзялілі ад Беларусі несправядліва. Вільня ўяўляе сабою культурны і геапалітычны інтарэс Беларусі.

[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] 1920 г. [illegible] [illegible], [illegible] сучаснасьць. Можна [illegible] даць да гэтага, што бяз Вільні без гістарычнае праўды прагматычна выглядае новае беларускае адраджэньне. Але нельга апраўдаць той правакацыйны характар, які набывае книжнае высакародзтва пры перанясе яго на глебу палітычнай рэальнасьці.

Разьлік на сілавую палітыку матываваны тым, што Летува — «нават» не ядзерная дзяржава (а новай Беларусі ў пэрыяд яе станаўленьня абавязкова патрэбны вораг. Вядома, слабейшы з магчымых) і тым, што нейкая колькасьць чалавечых ахвяраў — гэта ўсяго толькі непазьбежны вынік «геапалітычных інтарэсаў»; разьлік на «славянскае адзінства», якое ў сучасным палітычным кантэксьце можа разглядацца хіба як форма расізму і як пацьверджаньне гэтага, — няпрыязь да летувісаў; разьлік на далейшае несуб'ектнае існаваньне Беларусі (Расеі, якая «адбярэ нам Вільню», адводзіцца роля сілы) — усё гэта, высьнаванае ў Менску, зусім не стасуецца з той рэальнасьцю, якая ёсьць у Віленскім краі сёньня.

Між тым, рэальнасьць выглядае так. Ідэя далучэньня Віленшчыны да РБ ня будзе падтрыманая насельніцтвам Віленшчыны. Па-першае, у Летуве больш высокі ўзровень жыцьця і ў масе насельніцтва (пакуль прынамсі) існуе давер да летувіскага кіраўніцтва. Па-другое, Менск яшчэ ніколі не [illegible] [illegible]. На крэсах [illegible] [illegible] [illegible], а [illegible] [illegible] і да любых менскацэнтрысцкіх сацаў роўна 90%, жыхароў Віленшчыны выказалі нядаўна прыняўшы грамадзянства Летувы. Паводле апошняга перапісу, ва ўсёй Летуве толькі 63 тысячы чалавек назваліся беларусамі. А ў самой Вільні летувісаў сёньня не 1%, а больш за 50. Нарэшце, ці ня самае істотнае, — адсутнасьць якой-кольвек рэальнай палітычнай актыўнасьці беларусаў Вільні й Віленшчыны. Можна крытычна ставіцца да гэткай рэальнасьці, але не прызнаць яе за рэальнасьць — нельга.

У такіх умовах заявы зь Менску пра «адабраньне» ў летувісаў Вільні выглядаюць правакацыйна, бо фармуюць вэўныя адносіны да тутэйшых беларусаў («беларус — бальшавік», гэтае таўро тут яшчэ не забылася з польскіх часоў) і стымулююць да масавае летуанізацыі тых беларусаў, якія яшчэ называюць сябе беларусамі.

Але галоўны стымул да страты Вільні для Беларусі — гэта ўсё большае размежаваньне РБ і ЛР, варожасьць на ўзроўні міждзяржаўных зносінаў. Таму рэалістычная беларуская палітыка ў справе Вільні мусіць грунтавацца на іншых прынцыпах. А менавіта: толькі мірны і самастойны дыялёг зь летувісамі; актыўная пазыцыя Менску ў вабароне сацыяльных, эканамічных, культурных палітычных інтарэсаў тутэй[illegible] [illegible] [illegible], [illegible] [illegible] [illegible] Вільні [illegible] [illegible] беларусаў.

Гэтыя кр[illegible], будзе ар[illegible] зьмены й падтрыманы беларусамі Віленшчыны. (За выключэньнем хіба тых былых работнікаў КПЛ-КПСС, для якіх ідэя сілавога далучэньня Вільні да РБ з дапамогай Расеі стала ідэяй «последнего и решительного боя». Стаўшы раптам беларусамі, яны называюць свае крыўды крыўдамі беларускай дыяспары, абмінаючы пры гэтым рэальныя праблемы тутэйшых беларусаў. Яны ўводзяць у вушы менскага кіраўніцтва, маўляў, Віленшчына ледзь ня заўтра гатовая падняцца за далучэньне да Рэспублікі Беларусь... Цяжка сказаць, чые тут прысутнічаюць геапалітычныя інтарэсы: толькі экс-апаратчыкаў ці новае імпэрскае Масквы. Але што не беларускага адраджэньня, дык гэта пэўна).

Беларусам трэба аднавіць сваю прысутнасьць у Вільні — свае грамадзкія і эканамічныя структуры, школы, музэй, друк, — беларускае жыцьцё. Сёньня для гэтага ёсьць аб'ектыўная патрэба, але бракуе кадраў і сродкаў. Магчыма, некалі Вільня сапраўды стане самастойным горадам і тут будзе краёвы сойм з удзелам усіх нацыянальных супольнасьцяў, якія й вырашыць — пад чыёй юрысдыкцыяй існаваць месту і краю. Але гэта ўжо справа іншай палітыкі, у якой для папулізму мейсца няма.

(брат)

[illegible]

Пяць стадыяў супрацоўніцтва з КГБ

Пасьля выкрыцьця [illegible] летувіскага [illegible] Віргініюса Чапайціса як былога супрацоўніка КГБ, парлямант Летувы рэкамендаваў Чапайцісу скласьці свае дэпутацкія паўнамоцтвы. А ў дзяржаўнай газэце *Lietuvos Aidas* зьявіўся артыкул пра пяць стадыяў супрацоўніцтва з КГБ.

Першая стадыя — калі чалавеку прапанавалі, але ён не згадзіўся і праз гэта панес вялікія маральныя й матэрыяльныя страты. Другая — чалавек не жадаў супрацоўнічаць [і] думаў, што можа дэзынфармаваць КГБ, а ў выніку меў шмат маральных і матэрыяльных крыўдаў. Трэцяя стадыя — чалавек не жадаў супрацоўнічаць, але ня здолеў катэгарычна адмовіцца праўда і ніякай карысьці КГБ не прынес. Чацьвертая — чалавек не хацеў супрацоўнічаць, але пад націскам і запалохваньнем згадзіўся, аднак працаваў толькі пад наглядам без ініцыятывы і карысьці для КГБ. Пятая стадыя — чалавек жадаў супрацоўнічаць і актыўна дзейнічаў на мейсцы працы, у грамадзкіх палітычных арганізацыях.

У канцы гэтай публікацыі зьмешчаная парада: публічна пакаяцца толькі тым людзям, якія належаць да пятай групы, бо менавіта сярод іх могуць быць тыя, чые дзеяньні можна кваліфікаваць як злачынства.

Год казы мінуў,

а козы засталіся — піша газэта *Lietuvos Aidas*. Сапраўды, у 1991 годзе інтарэс да козаў у Летуве павялічыўся. Стварылася нават таварыства, якое аб'яднала 300 чальцоў-уладальнікаў тысячы коз. Некаторыя зь іх гадуюць вельмі каштоўныя швайцарскія пароды, што даюць 5-6 літраў малака штодня. А літар гэтага надта карыснага для здароўя прадукту каштуе сёньня на рынку 15-20 рублёў.

Разбой у вежы Гэдыміна

Дырэктар Гісторыка-этнаграфічнага музэю ў Вільні зьвярнуўся ў 5-ы паліцэйскі камісарыят з заявай, што ноччу невядомыя прабраліся ў вежу Гэдыміна, разьбілі тры вакны і вітрыны з экспанатамі.

Што рабіць з расейскай тэлевізіяй?

Рана ці позна такое пытаньне паўстане перад кожнай былой савецкай рэспублікай, якая стала незалежнай. Па-першае, прысутнасьць дзьвюх праграмаў чужой дзяржавы ў нацыянальнай тэлевізіі — нонсэнс, па-другое, рэтрансляцыя гэтых праграмаў каштуе вялікіх грошай. Але калі адразу раптоўна спыніць рэтрансляцыю, гэта выкліча пратэст прызвычаенага гледача. Патрэбны нейкі псыхалягічна вывераны спосаб. Магчыма, рэформа Летувіскае тэлевізіі ў гэтым сэньсе можа быць добрым прыкладам. Тут стварылі сваю другую праграму, перадачы якой «накрываюць» перадачы першай маскоўскай праграмы, акрамя самых звыклых і папулярных, як Навіны, ВІД, спартыўныя й музычныя шоў. Такім чынам першай маскоўскай праграмы ў Летуве ўжо фактычна няма, але прызвычаены глядач пры гэтым мае ўсе свае перадачы. Тое сама чакае і другую маскоўскую праграму. Праграму Польскае тэлевізіі будуць «накрываць» перадачы адмыслова створанае Тэлевізіі Ўсходняе Летувы (Віленскага краю).

Што чакае Летуву заўтра?

Па даручэньню МЗС Швэцыі міжнародная група незалежных экспэртаў падрыхтавала першы сістэмны аналіз трох балтыйскіх дзяржаваў, які надрукавала газэта *Lietuvos rytas*. Якімі ж будуць гэтыя дзяржавы заўтра?

УЛАДА. Яе структуры будуць фармавацца тут ня менш чым 2-3 гады. У пошуку «ідэалева функцыянальных» структураў палітычныя лідары не стрываюць перад спакусай інкарпараваць у апарат людзей з «праслойкі», падбіраючы іх не за кампэтэнтнасьць, а за аддасьць кіраўніку. Таму кожны год ці паўтара структура апарату будзе карэктавацца. Апарат накінуць 75-80% работнікаў, якія працавалі да здабыцьця незалежнасьці. Сыйдуць з палітычнае арэны й некаторыя лідары. На хвалі сапраўднага нацыянальнага адраджэньня зьявіцца няма[л]а маладых кампэтэнтных кіраўнікоў.

ЭКАНОМІКА. Увядзеньне нацыянальнай валюты разам з новымі сістэмамі падаткаў і мытных пошлінаў непазьбежна выкліча вялікі дэфіцыт бюджэтаў. У Летуве гэты дэфіцыт можа дасягнуць 43% вартасьці сукупнага нацыянальнага прадукту. Вялікія надзеі будуць на замежныя інвэстыцыі. Аднак наўрад ці адбудзецца замежная інвэстыцыйная «інтэрвэнцыя», а дапамога з-за мяжы — будзе дастатковая, апэратыўная і рэгулярная. Таму вырашыць самую сур'ёзную эканамічную праблему Прыбалтыкі — вырвацца з залежнасьці ад Усходу — будзе вельмі складана. Выхад — садружнасьць краінаў Балтыйскага басэйну. Да гэтага мэтазгодна стварыць Прыбалтыйскую вунію, у якую ўвайшлі б Летува, Латвія, Эстонія. Гэты альянс абвесьціць сябе вольнай эканамічнай [зо]най і адыграе ролю «балтыйскага моста» між Захадам і Ўсходам, зарабіць на [illegible] геаграфічным становішчы.

ВАЕННАЯ ПАЛІТЫКА. [illegible] ныя арміі прыраўняюц[ца] [illegible] Нарвэгіі. Узбраеньне бу[дзе спа]чатку савецкае, а пась[ля] набывацца і на Зах[адзе] [illegible] Швэцыі, якая выпуска[е] [illegible]ную ваенную тэхніку, [illegible] самалёты, і ў Нямеччы[не] [illegible]вад войска СССР мо[жа] [illegible]нуцца. Прыбалтыка [illegible] рымліваць ад СССР [illegible]ныя льготы й валютны[я] [illegible]пленьні — як плат[у] [illegible] кацыю і ўтрыманьне [illegible]цаў.

Правы папулізм у сучаснай Эўропе

«Прывід крочыць па Эўропе, — піша лёнданская газэта *The Times*, — прывід фашызму!» Крах камуністычнае ідэалёгіі й тыя зьмены, якія адбыліся ў Старым Сьвеце за апошнія гады, — усё гэта прывяло да актывізацыі скрайніх правых сілаў.

Новыя правыя не ўбіраюцца ў даўнія нацыстоўскія строі, брунатныя кашулі. Замест класычнай шавіністычнай ідэалёгіі яны абіраюць тактыку пратэсту, заклікаюць да неадкладнага й радыкальнага вырашэньня палітычных праблемаў, арыентуюцца на папулізм. «Мы гучна гаворым пра тое, пра што іншыя думаюць ціхком». Пад такім лёзунгам партыя скрайніх правых «Blok Vlaamsa» атрымала значны посьпех на нядаўніх выбарах парляманту Бэльгіі. У іншых краінах скрайнія правыя выглядаюць гэтак:

ФРАНЦЫЯ. Нацыянальны Фронт ужо даўно заваяваў сабе мейсца ў палітычным жыцьці краіны. У 1988 годзе ягоны лідар Жан-Мары Ле Пэн у першым туры прэзыдэнцкіх выбараў атрымаў 15 працэнтаў галасоў. Ягоную палітыку характарызуюць выказваньні кшталту: газавыя камеры нацыстаў — гэта ўсяго толькі дэталь другой сусьветнай вайны. Вастрыё атак Нацыянальнага Фронту скіраванае [су]праць іншаземцаў.

НЯМЕЧЧЫНА. [illegible] правыя партыі ў Заходняй Ня[меччыне] [illegible] [illegible] супраць «інвазіі чужаземцаў», праўда іхнія посьпехі на выбарах дагэтуль былі вельмі сьціплыя. А вось ужо аб'яднаную Нямеччыну заліла нечуваная хваля гвалту ў дачыненьні да іншаземцаў. Найбольш актыўныя — маладыя «паголеныя галовы» пад лёзунгамі нэанацыстаў. Правая экстрэмісцкая Нямецкая Народная Унія ў верасьні ў часе выбараў атрымала 6,2 працэнты галасоў. Дэвіз: «Нямеччына — для немцаў!»

АЎСТРЫЯ. Аўстрыйская Партыя Свабоды з Гайдэрам на чале падчас выбараў ў Нацыянальную Раду набрала 16,6 працэнтаў галасоў, а на рэгіянальных выбарах у Вене ў мінулым лістападзе — 22,6 працэнтаў. Гайдэр называе аўстрыйскі народ «ідэалягічным выродкам» і хваліць нацыстоўскія парадкі. Вострыя атакуе кіраўнічыя «старыя партыі» [і] іншаземцаў.

ШВАЙЦАРЫЯ. Правыя папулісты разам зь Зялёнымі [illegible] выступілі на апошніх выбарах пад лёзунгам: «Менш дзяржавы!», а таксама [с]упраць іншаземцаў.

ШВЭЦЫЯ. На верасьнёўскіх выбарах у парлямант правая партыя Новай Дэмакратыі атрымала каля 7 працэнтаў галасоў. [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]макратыі.

ІТАЛІЯ. [illegible] [illegible] фашысты ўжо некалькі гадоў задавальняюцца 2-5 працэнтамі галасоў выбарнічыкаў. Нядаўна тут зьявілася новае палітычнае згуртаваньне без выразнай ідэалёгіі — т.зв. Лёмбардзкая Ліга. Яна мае правы, з выразнымі шавіністычнымі рысамі, кірунак. На лякальных выбарах Ліга ўжо дамаглася значнага посьпеху.

УСХОДНЯЯ ЭЎРОПА. На прэзыдэнцкіх выбарах у Польшчы нечаканы посьпех спаткаў правага папуліста Станіслава Тымінскага. Ужо пазьней ён казаў пра «праклятых жыдоў», страшыў, што Варшава стане «жыдоўскай калёніяй». У часе апошніх выбараў папулісты шавіністычнага кірунку здабылі 7 працэнтаў галасоў.

У Румыніі ўтварылася партыя правых экстрэмістаў. Грамадзкія апытаньні сьведчаць, што ўжо сёлета яны маюць неблагія шанцы на выбарах у парлямант. У Румыніі перасьледуюць вугорскую меншасьць, [у] Балгарыі — туркаў.

У грамадзянскай вайне ў Югаславіі найбольш актыўна ўдзельнічаюць правыя экстрэмісты як сербскія, так і харвацкія. *The Times* піша, што ва Ўсходняй Эўропе хутка набірае сілу ўплыў правых, а таксама экстрэмісцкі нацыяналізм, якому спадарожаць [illegible] і антысэмітызм.

Зразумела, [шт]о прыведзеныя [illegible] [illegible]. Бо ніяк ня менш [illegible] Швэцыю ці Аўстрыю на [illegible] [illegible] папулізму [illegible] [illegible] Расея і яе суве[рэн]ныя [illegible] [illegible] [illegible] правы [illegible] [illegible] [illegible] знаходзіцца ў [illegible].

Хто паедзе на Гульні?

Удзел летувіскіх спартоўцаў на сёлетніх алімпіядах у Альбэрвілі й Барсэлёне абыдзецца адпаведна ў 70 і 500 тысячаў даляраў. Гонар Летувы мераюцца бараніць 2 лыжнікі, 2 біятляністы, 12 баскетбалістаў, 3 пяціборцы, 7 лёгкаатлетаў, 3 раварысты, 1 дзюдаіст, 3 весьляры.

Мячэці ВКЛ

На сёньняшні дзень у Летуве дзеяць 4 мусульманскія мячэці — у Коўне, у Райжах (Алітаўскі раён) ды ў падвіленскіх Немежы й Саракох Татарах, адкуль паходзіць, дарэчы, славуты Кітаб Віленскага беларускага музэю. Віленская мячэць на Лукішках, збудаваная ў 1558 г., была разбураная ў 1958 г., а на яе мейсцы пастаўлены будынак Інстытута эканомікі АН... У 1997 г. споўніцца 600 гадоў ад часу заснаваньня мусульманскіх грамадаў у Вялікім Княстве Літоўскім.

Падрабязная мапа

моваў і нацыянальнасьцяў Віленшчыны (паводле дадзеных экспэдыцый летувіскіх і польскіх навукоўцаў, што была праведзеная ў 1989 годзе) надрукаваная 12 студзеня ў дзяржаўнай газэце *Lietuvos Aidas*.

Мэталёвыя літы

і цэнты ў сакавіку пачнуць біць у Вільні. Для гэтага створана адмысловае прадпрыемства з ангельскім абсталяваньнем. Манэты будуць на 1, 2, 5, 10, 20 і 50 цэнтаў, на 1, 2 і 5 літаў. Між тым, шмат летувіскіх манэт ужо прывезена з Англіі.

Аптымісты й пэсымісты

Ведамая асацыяцыя Gallup International правяла на прыканцы мінулага году апытаньне ў 45 краінах сьвету, якое ўпершыню [illegible] некаторыя асяродкі былога СССР. Сутнасьць [illegible] можна абагульніць адным: Ці чакаць чаго добрага ад 1992 году? Паводле вынікаў, у Заходняй Эўропе найбольш аптымістаў жыве ў Вялікабрытаніі, пэсымістаў — у Нідэрляндах. Цэнтральная і Ўсходняя Эўропа: найбольшыя аптымісты — Летува [illegible] [illegible] імі йдуць Расея [illegible] Эстонія, Польшча, Славакія, найменш [illegible] — у Вугоршчыне [illegible] першыя ня толькі [illegible] [illegible]най і Ўсходняй Эў[ропы], [але й] ва ўсім сьвеце.

Дзе нашы ляўрэаты прэміі Нобэля?

Скептычныя абразкі з Гарадзенскага жыцьця



•Гарачыя р. ы

У вапошні раз

7 га лістапада каля дзядзькі Леніна не было прымусовага тлуму Купка вабласное намэнкля туры — паводле старое звычкі — паклала да чыгунных чаравікаў свайго стода традыцыйныя гваздзікі Цікава, што гарадзкое начальства ў гэтай надзіва сьціплай цырымоніі ўдзелу ня брала, затое былі два ці тры генэралы. Па-над апячатаным гаркамам віселі сьцягі колеру чарна пралітае крыві

Звышкансьпірацыя

Як таямніча паведамляла польскамоўная абвестка ў фарным касьцеле, 10 лістапада мела адбыцца ўрачыстасьць з самадзейным канцэртам з прычыны «ўгодкаў незалежнасьці» але якой незалежнасьці — не паведамлялася. У прызначаны час сабралася з тузін гледачоў, аднак ніякае ўрачыстасьці яны не дачакаліся. Канцэрт адбыўся ажно 12-га Такім падпольным чынам у нас было адзначана 73 годзьдзе адраджэньня польскае дзяржавы

Зблыталі адрас

У другой палове лістапада горад меўся наведаць швайцарскі танцоўны тэатар «Ракаса» Афішы чырвона паведамлялі: «Упершыню ў Расеі!» Далей пералічваліся адрасы гастроляў Санкт Пецярбург, Гродна (?!), Мінск!!! Магчыма, у маленькай Швайцарыі, нічога ня чулі пра нашую Беларусь. Рэч аднак у арганізатарах гастроляў — нейкай «міжнароднай» асацыяцыі, пра адрас якой няцяжка здагадацца

Кан-сьпі-ратары!

У друку зьявілася бальшавіцкая заява Хочуць, маўляў, надалей змагацца за нашую сьветлую будучыню ў сваіх партшэрагах. Увагу гарадзенцаў прыцягнула сярод подпісаў прозьвішча, насупраць якога было пазначана: супрацоўнік шматтыражнае газэты «Рытм» Асабліва, мусіць зьдзівіліся ў самой рэдакцыі Хтусьня яка й

Доктар Міхнюк — «гэты» і «той»

Валяньцін Грыцкевіч

Пераход ад старога да новага найбольш лёгкі
і найменш стратны
па «нулявым» варыянце,
калі адбываецца перадача ўсяго і —
забудзем крыўды.
Што праўда, такі варыянт
магчымы толькі тады,
калі новае ёсьць,
калі яно, прынамсі, роўнае старому
Новая ўлада, навука
(новы а мудры гісторык),
культура, якая доўгі час сьпела
ў падпольлі, а цяпер вось выйшла.
І пачалося, паводле Абдзіраловіча,
тое «творачы — зруйнуем»,
дзе другога тым менш,
чым лепш падрыхтаванае новае.
У нас, на Беларусі,
амаль нічога ня сьпелілася ў падпольлі
й зусім мала зьявілася з новымі людзьмі
новага пакаленьня
Наша новае вырастае,
перараджаецца са старога.
Таму й самое новае ў нас амаль спрэс —
хамелеонства
Атрымліваецца, што адзіна магчымы
для нас поступ грунтуецца
на амаральнасьці?
Гэта стараюцца прыхаваць
словамі каштату —
празрэў, пакаяўся, падняўся над...
Гэта глушаць гучнымі дыфірамбамі
дэмакратыі, свабодзе, Бацькаўшчыне
А яно ўсё адно відаць.
Хамелеонства.
Чалавечае асяродзьдзе ў нас
працятае парадоксам
чаму так шмат гэтых добрых словаў,
але ніякіх амаль добрых справаў?
Чаму заклікаюць тварыць,
а самі толькі руйнуюць?
Чаму новае не вядзе
да новае сітуацыі жыцьця?
Можа таму, што яно й ня новае зусім
(як, зрэшты, і не старое),
а прамежкавае, пераходнае,
вечна пераходнае
ад чагосьці да нечага
(прычым — усё адно, чаго)

Падобны да яшчаркі і той жа велічыні...
мяняе свой колер на той,
на які глядзіць апроч чорнага і жоўтага,
што мы часта выпрабоўвалі...
І калі яго пасадзіць на нейкі колер
а іншы зь іншага боку зьверху трымаць,
то на абодва адразу глядзіць,
на які потым больш старанна,
што вачэй не адвядзе,
у той колер зьменіцца.

Мікалай Крыштап Радзівіл «Сіротка». Апісаньне паўзуна хамелеона, якога ён назіраў у 1583 г у Іопе (пазьней — Яфа, тады ў Палестыне, цяпер у Ізраілі).

Некаторыя рэчы асэнсоўваюцца не адразу, не тады, калі ўпершыню чытаеш артыкул, а толькі тады, калі яго перачытваеш. Я зьвярнуў увагу на адзін такі артыкул нядаўна

Уладзімер Міхнюк «Сумленна служыў народу». Пра Ўсевалада Ігнатоўскага *ЛіМ*, 17 траўня 1991 году. Па-сутнасьці гэта даклад, які доктар гістарычных навук, прафэсар Інстытута паліталёгіі й сацыяльнага кіраваньня КПБ Міхнюк зрабіў у Акадэміі навук БССР да 110-й гадавіны ад нараджэньня Ўс.Ігнатоўскага

Пачынаецца артыкул з таго, што грамадзкі дзеяч, навуковец, гісторык Ігнатоўскі ў кастрычніку 1990 г быў «рэабілітаваны ў партыйным дачыненьні» самім першым сакратаром ЦК КПБ Яфрэмам Сакаловым, на што «не хапіла сьмеласьці й прынцыповасьці нават у такіх аўтарытэтных лідараў партыйнай арганізацыі рэспублікі, якімі зьяўляліся К Мазураў і П Машэраў». Далей распавядаецца пра палітыку беларусізацыі першай палові 20-х гадоў, якой перашкодзілі «антынацыянальныя беларусафобскія «элемэнты»... імкненьне пэўнай групы асобаў вывесьці з важнейшых пасадаў беларускія кадры»

Аўтар артыкула апісвае, як чарговы зьезд КПБ вылучыў лёзунг барацьбы зь беларускім нацыянал-дэмакратызмам, што прывяло да разгону беларускай інтэлігенцыі; са спачуваньнем нагадвае, як былі арыштаваныя А.Смоліч, А Цьвікевіч, Я.Лёсік, В Ластоўскі й яшчэ сотня асобаў зь ліку дзячоў навукі й культуры, якія нібыта належалі да «Саюзу вызваленьня Беларусі». Як піша Міхнюк, першай фізычнай ахвярай гэтага павароту стаў Ігнатоўскі. Пра тое, што вучоны, не чакаючы на арышт, скончыў самагуб ствам, у вартыкуле не прыгадваецца

Далей аўтар абвінавачвае тых, хто залічваў Ігнатоўскага на працягу шасьцідзесяці гадоў у чорныя сьпісы лідараў беларускага нацыяналізму Гэта былі «антыбеларускія, антынацыянальныя сілы на чале з партыйнымі функцыянэрамі ад ідэалёгіі, такімі, як А Кузьмін, Ю Сьмірноў, Л.Калыхан і іншыя, (якія) эксплюатавалі створаны ў канцы 20-х гадоў нацыяналістычны вобраз (Ус Ігнатоўскага. — В.Г.)»

«Для падтрыманьня атмасфэры беларусафобіі нястомна працаваў апошнія 15 гадоў доктар гістарычных навук, прафэсар А Залескі, які, як і яго папярэднік па гэтым рамястве член-карэспандэнт АПН СССР Л Абэцэдарскі, даўно дыскрэдытаваў высокія тытулы вучонага... У папцы матэрыялаў аб партыйнай рэабілітацыі У.Ігнатоўскага з 227 машынапісных старонак 91 належыць А Залескаму Сярод таго шматстаронкавага квазінавуковага сьмецьця часьцей за ўсё сустракаюцца такія ярлыкі-характарыстыкі, як «главарь белорусского национализма», «махровый белорусский националист», «ярый монархист»

Здаецца, звычайны, як на наш час, артыкул Але штосьці ў ім ня так Што менавіта?

У цкаваньні Ігнатоўскага, Смоліча, Лёсіка ды іншых павінныя «антынацыянальныя элемэнты» 20-х гадоў, «партыйныя функцыянэры ад ідэалёгіі» на працягу 60-ці гадоў, Залескі, Абэцэдарскі, і ўсё. І толькі. А ня тая бальшавіцкая сістэма, якая спараджала «элемэнтаў», «функцыянэраў», Залескага і Абэцэдарскага, супраць якіх выступае доктар Міхнюк

Яшчэ — выпінаецца пракурорскі стыль, у якім Ул Міхнюк выкрывае тых, хто цкаваў памянёных «нацыяналістаў» Цікава, што гісторыкі, якія больш канкрэтна і, трэба сказаць, больш абгрунтавана крытыкавалі Залескага з Абэцэдарскім, — а менавіта, М.Ткачоў і С.Падокшын, — не дазвалялі сабе такога стылю

Зрэшты, рэч ня толькі ў стылі

Усяго за шэсьць гадоў да гэтага артыкула Ул Міхнюк у сваёй манаграфіі «Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919—1941 гг)» цэлы разьдзел — «Разоблачение взглядов белорусских националистов» прысьвяціў разгрому поглядаў памянёных Смоліча, Лёсіка, Ластоўскага, Цьвікевіча Зусім у стылі Залескага і з цытатамі з Абэцэдарскага Памянёныя гісторыкі, паводле «таго» Міхнюка, «свою антисоветскую работу, выступления против существующего социалистического строя

есьць хлусьня. Новы супрацоўнік аднак ня быу зусім мёртвай душой, у горадзе яго добра ведаюць, гэта — беспрацоўны пасьля няўдалага пучу былы сакратар парткаму вытворчага аб'яднаньня «Хваля»... Уладзімер Іліч, напэўна, паставіў бы сёньняшнім канспіртатарам у іхніх спытках калы...

Неспадзяванка зь яйкамі

Адзін дырэктар бройлернае фабрыкі паехау па нейкую справу ажно ў Маскву. Каб ўсё залатвіць, хапіла адных моцных напояў. Везьці назад 30 дзесяткаў выборных яек не выпадала. Вывезьлі на рынак. Адразу знайшоўся пакупнік. Колькі? — пытае. Беларус пачухаў патыліцу дый кажа няўпэўнена: па тры рублі (у нашых крамах звычайныя яйкі былі па 2.60 за дзесятак). Той, падлічыўшы штось на мікракалькулятары, дае спаталыжанаму дырэктару 900 рублёў. Прадзешавіў ты дзядзька, выходзіць!

Валэнса ў заапарку

Самайронію, досьціп і добрае вучнёўства выявілі нашыя суседзі — палякі, стварыўшы на капыл «Маппэт-шоў» лялечную тэлечарадоўку «Польскі заапарк». Адрозна ад брытаў іхняя праграма цалкам палітычная паводле складу лялек. Валэнса — развважны нетаропкі леў (жонка Дануся — мышка) Мазавецкі — чарапаха, Бальцаровіч — зь нязграбнаи храпай конь у аакулярах Бялецкі — рысь, новы прэм'ер Альшэўскі — каала, ген. Ярузэльскі — даўгадзюбая птушка ў чорных акулярах, Курань — чамусьці, зялёны бэгемот, кіраўнік лявіцы (і разам абаронца беларусаў) Цімашэвіч — шакал. Новыя чарадоўкі выходзяць у эфір штотыдзень Праграму вазілі ўжо у Амэрыку. У Беластоку квіток на яе каштаваў 40 тысяч злотых.

Жніво імя Багдановіча

Апошняй перадпучавай і напэўна, наогул апошняй пастановай Лідзкага райкаму КПСС быў надзвычай патрыятычны дакумант 17 жніўня тут падвялі вынікі працоўнае вахты (жніва) у гонар 100 годзьдзя з дня нараджэньня М.Багдановіча. У пастанове названыя лепшыя камбайнёры, трактарысты, шафёры, якія вызначыліся на жніве. Цікава як без райкаму адбудзецца селетняе жніво і ў гонар якога літаратурнага класыка будзе жаць збажыну пазбаўлены стырнавога народ?

«Абгрызены» крыж

Скандал здарыўся на старых праваслаўных могілках у Горадні пад час асьвячэньня помніка на магіле маці Максіма Багдановіча Праваслаўны сьвятар, які мусіў адслужыць імшу абурыўся. Выяву крыжа Эўфрасіні Полацкай на гранітнай брылі ён назваў блюзьнерскім парушэньнем праваслаўнага канону, а сам крыж — «абгрызеным» (адзін бок крыжа невыразна акрэсьлены). З гэткімі наводзінамі сьвятара не згадзіліся нават праваслаўныя беларусы Калі быў парушаны канон, лічаць яны, пра гэта трэ было сказаць далікатна і ня ў часе імшы

Дзе нашыя Нобэльскія ляўрэаты?

Знаёмы мытнік заўважыў яшчэ ўлетку першыя запісы ў дэклярацыях у графе «краіна сьледваньня»: Беларуская Рэспубліка. Асабліва ахвотна ўпісвалі гэтыя словы беластоцкія беларусы а таксама некаторыя палякі. Адзін знаёмец гасьцяваў напярэдадні Новага Году ў Беластоку. Вяртаючыся, па звычцы ўпісаў у дэклярацыю: сьледую ў СССР і з сорамам заўважыў, як паляк побач напісаў «у Рэспубліку Беларусь» Знаёмец апавядаў, як на прыватках адзін з палякаў (зь беларускім, праўда, прозьвішчам) прыхільна выказваўся пра Беларусь і беларусаў Іншы зьдзекліва пытаўся, называючы польскіх ляўрэатаў Нобэля што гэта за край такі і колькі беларусы маюць нобэльскіх уладальнікаў Адказаць не было чаго. Нават пра пасьледкі вылучэньня на літаратурную прэмію Нобэля В.Быкава (дарэчы, ён быў вылучаны ў Беластоку і Рыме) нічога невядома Няма дзяржавы няма й ляўрэатаў

У падземным пераходзе на Трафальгар'пляцы

Падзарабіўшы музыкай на вясельлях, гарадзенскія хлапцы нейкім чынам дасталіся ў Лёндан. Гралі на вуліцах, у падземных пераходах. Дагадзілі нейкай фінцы фінскай полькай, прыняў за сваіх адзін расеец. А потым найдасьведчаны зь іх, дарэчы мянчук, прапанаваў пашукаць беларусаў: павінны быць таксама. У вадной царкве ім паведамілі адрас. Патрапілі яны да сваіх вельмі дарэчы — на нейкае сьвята. Размаўлялі гаспадары ўсе чыста па-беларуску а іхнюю расейскую гаворку разумеў ня кожны... Цяпер з таго ўжо мінула крыху часу, і пацягнула музыкаў зноў да сваіх, у Лёндан

Наш сіндром

У вадным раицэнтры гасьцявала сям'я зь Вялікабрытаніі. Не былі на Бацькаўшчыне яны ад пасьля вайны. Дома размаўляюць, натуральна, па-ангельску. Дачка вывучала францускую філялёгію ў Парыжы, а зараз у Кіеве вывучае расейскую мову. Ад беларушчыны ў іхніх сэрцах не засталося анічога. Яны й сваё прозьвішча — Дарашкевіч — лічаць польскім

Беларуска эспэранцкая шыльда

Побач з турмой на вул Маркса 5 прыпечатавалі чорную шыльду у дзьвюх мовах: беларускай і эспэранта. Паведамлясцца, што ў гэтым доме ў 1893-97 гадох жыў вынаходца штучнай мовы эспэранта Замэнгоф. Звыклым да імя Людвіг у навіну яго сапраўднае — Лазар ды яшчэ Маркавіч. Падобная шыльда вісіць у Беластоку на вул Варшаўскай, дарэчы, насупраць сядзібы БГКТ А нарадзіўся Л.Замэнгоф у Варшаве.

У «Кляштары» няма кавы

На каталіцкія каляды ў Музэі гісторыі рэлігіі (базыльянскі кляштар) адчынілася мастацкая выстава двох мясцовых беларускіх мастакоў. Усё было вельмі цікава, прысутнічаў гарадзкі бургамістар. Аднак прымеркаванага да гэтага дню адкрыцьця тутака ж беларускай кавярні «Кляштар» не адбылося. Няма кавы. Не атрымалася пакуль і з дастаўкай кавы беластоцкімі беларусамі. Цяжкая навука — камэрцыя.

Вецер ірве сьцягі

Напярэдадні Новага Году з 8-павярховага гмаху Гарадзенскага аблвыканкаму зьнік Дзяржаўны сьцяг. Як растлумачылі у выканкаме, на вялікай вышыні ўвесь час моцны вецер. Самотужна пашытыя бел-чырвона-белыя сьцягі шкамутае, і іх хапае ненадоўга. У выканкаме вырашылі чакаць фабрычна зробленых сьцягоў з дыхтоўнае тканіны. А пакуль над уваходам павесілі невялікі сьцяг.

Пляменьнік Радаслава Астроўскага

У Горадні памёр акадэмік Ю Астроўскі. Ён першы у горадзе забіў трывогу пасьля Чарнобыльскае катастрофы, чым вельмі не дагадзіў начальству Усе наступныя гады бальшавікі моцна цкавалі акадэміка, зьбіралі на яго кампрамат. Летась ён выступіў у мясцовым друку з артыкулам пра этнагенэз беларусаў, дзе даводзіў, што паводле генэтычных асаблівасьцяў жыхары Беласточчыны й Гарадзеншчыны аднолькавыя, але адрозьніваюцца ад жыхароў Вялікапольшчы, чым выклікаў абурэньне сярод мясцовых палякаў кім ты чуесься тым ты і ёсьць... На пахаваньне прыехалі са сталіцы акадэмік Я Канапля і старшыня Грамады праф. М.Ткачоў Нябожчык быў прыязны з Ларысай Геніюш У горадзе заўжды гаварылі пра тое што ён — пляменьнік Прэзыдэнта БЦР Р Астроўскага. Адпеты нябожчык быў у праваслаўным саборы.

С А

Горадня
лістапад — сьнежань — студзень.

продолжили и после того, как формально признали Советскую власть и вернулись в Белоруссию» «Они... муссировали. националистические извращения истории Белоруссии.. Такой квазинаучный хлам всецело служил «историческому» обосиованию и реабилитации буржуазного национализма»

«Той» Міхнюк называе В Ластоускага «наиболее одиозной фигурой на буржуазно националистическом небасклоне Белоруссии», А Смоліча ганіць за тое, што даводзіў, быццам беларускі народ ня меў клясаў, погляды А.Цьвікевіча, на думку аўтара, супадалі з антымарксісцкімі поглядамі М Даўнар-Запольскага. Дасталося ад доктара Міхнюка і *Нашай Ніве*, «многочисленные официальные материалы» якой «выражали интересы эксплуататорских классов»

А што ж Ігнатоускі? І ен атрымау сваё ад «таго» Міхнюка У тым, што Таварыства гісторыкаў-марксістаў не заўсёды вяло «последовательную борьбу против националистических интерпретаций основных проблем истории Белоруссии и Компартии республики» быў павінны склад таварыства, «в рядах которого находилось немало выходцев из непролетарских партий», і ў тым ліку Ус.Ігнатоўскі. Гэта ён, Ігнатоўскі, не паказаў усю складанасьць сацыяльнага разьвіцьця Беларусі на розных этапах, бо «повторял антинаучные взгляды некоторых буржуазных историков», некрытычна запазычыу з немарксісцкай гістарыяграфіі тэзіс аб сэпаратызьме К.Каліноўскага ідэалізаваў Беларускую сацыялістычную грамаду лічачы яе першай сацыялістычнай партыяй на Беларусі, выказваў няслушны погляд на тое, што левая плынь адраджэнскага руху ўлілася у рэвалюцыйны паток Вялікага Кастрычніка і г.д

Здаецца, навошта ў кнізе пра гістарычную навуку БССР 20-30-х гадоў даваць ацэнку сучасным замежным беларускім гісторыкам? І тым ня менш, «той» Міхнюк, які, сьледам за Абэцэдарскім і Залескім, ня мысьліў гістарычную манаграфію без так званае «контрпрапаганды», піша пра А Адамовіча, В.Глыбіннага, Я Запрудніка, В Тумаша й іншых. «Сегодняшние антикоммунисты воскрешают стряпню пращуров белорусского национализма», «Фальсификация, тенденциозность, подтасовка фактов характерны для публикаций в «белорусских сборниках», «запісах».. Извращенная история белорусского народа в почете на страницах националистических газет» І ў падборы найменьняў для «навуковых апанэнтаў» «той» Міхнюк не адстае ад сваіх калег Абэцэдарскага і Залескага «мюнхенские писаки», «исследователи» из буржуазно-националистического лагеря» «националистическое отребье» «грязные инсинуации» А завяршае ўсё гэта такі красамоўны пасаж «Знакомство с писаниями националистов, дискредитирующими науку, показывает, что полет исторической мысли «друзей» белорусского народа не высокого класса Писать, а точнее лгать, фальсифицировать его историю им надо так, как велят хозяева, которым они добровольно нанялись служить» Доктар Міхнюк 1985 год

Вось дзе сапрауды прастора для развагаў пра «нанятых гісторыкаў», якія памянялі ролю навукоўцаў на ролю ідэолягаў кіраўнічае партыі.

Памяненая кніга «таго» Міхнюка была накіраваная на апраўданьне таго, што адбывалася ў беларускай гістарычнай навуцы калі бэсьціліся й зьнішчаліся лепшыя маладыя прадстаўнікі гэтай навукі, а потым і тыя, хто бэсьціў ды зьнішчаў іх Канцэпцыю гістарыяграфіі доктара Міхнюка можна зьвесьці да наступнага: «Пажар быу правільны і ўсё гарэла слушна»

Нават калі паспрабаваць апраўдаць усе прыведзеныя цытаты 1985-м годам, — не атрымаецца. Усё значна глыбей «Большое влияние на совершенствование работы института (гісторыі АН БССР — В.Г.), усиление его роли в идеологической деятельности партии оказало письмо И.В.Сталина в редакцию журнала «Пролетарская революция» Обсудив его, коллектив института наметил и осуществил ряд мер по дальнейшему улучшению исследовательской работы и прежде всего укреплению связи с практикой социалистического строительства Были вскрыты политические ошибки отдельных сотрудников разоблачены и выгнаны троцкистские оппозиционеры, разгромлены белорусские националисты, подвергнуты критике шовинистические схемы бундовцев» Вось вам і 85-ы год Вось вам і «той» Міхнюк

«Гэты» Міхнюк ужо не зьвяртаецца да згаданага ліста Сталіна які сучаснымі гісторыкамі ацэнены як паваротны пункт у гістарычнай навуцы ад больш менш адкрытай дыскусіі да ўсталяваньня жорсткай дагматызацыі грамадзкае думкі. «Гэты» Міхнюк «рэабілітуе» беларусізацыю 20-х гадоў, ня згадваючы, праўда, што яна была дазволеная бальшавіцкім цэнтрам у абмежаваных памерах і моцна нагадвала гульню ката з мышамі.

Дзіўная ўсе ж мэтамарфоза, дзіўная этыка «Бросил все, что прежде знал, что так любил, чему так жарко верил»... А можа, — тыповая этыка, клясычны ўзор хістаньня разам з генэральнай лініяй партыі? Такім людзям усё адно, каго праклінаць, ад каго адракацца, на каго звальваць усе грахі, у тым ліку і свае. Учора ён кляў нацыяналістаў, сёньня — тых, хто кляў нацыяналістаў, заўтра Каго ён пракляне заўтра?

Але ці ж адзіны такі гісторык — доктар Міхнюк? Ягоны прыклад — хутчэй правіла, чым выключэньне І, калі ўжо абагульняць, дык тое самае можна сказаць пра ўсю савецкую грамадзкую практыку.

Патрэбная верыфікацыя вучоных ступеняў і званьняў; калі дысэртацыі й манаграфіі па гісторыі Беларусі былі ўсяго толькі працамі прапагандысцкага жанру, дык наўрад ці варта пацьвярджаць «заслужаныя» праз ступені й званьні. Камісію па верыфікацыі можна стварыць з тых навукоўцаў якія не спакусіліся на танны хлеб няпраўды Іх ня так і шмат, але яны ёсьць. Гэта іхнія працы не прымаліся выдавецтвамі ці прымаліся зь цяжкасьцю, а выдаваліся з купюрамі. Гэтыя працы чыталіся й чытаюцца на Беларусі. Яны не страцілі свае вартасьці пры крутой зьмене палітычнага курсу

Разам з камісіяі па верыфіка[illegible] можна адкрыць службу [illegible] цаўладкаваньня тых, чыя «творча[illegible] ня мае нічога агульнага [illegible] гістарычнай навукай.

* * *

Праз дні і ночы нас пільнуе страх
на вулках Вільні, і ў тваіх вачах —
там толькі ён заместа рэк і мораў.
У мілым доме песьняў не пяюць
а цягнуць нэндзу новую сваю —
пра сьмерць і хлеб,
і зноў пра сьмерць гавораць

Ч выйду у ноч, пакуль сабе ня веру,
я выйду — асьцярожным,
чуйным зьверам
каб у дарозе збыць жуду-нуду...
І набяжыць з чужых краёў старожа
сказаць пра ўсё — паверыць і паможа,
ды я ад страху словаў не знайду

ТС



Азіяцкая ноч няволі над «мілым горадам» —

голад, галеча і тэрор у сяньняшняй Вільні

Куды падзелася ўся беларушчына Вільні, якая спрадвеку і аж да мінулае вайны займала значнае мейсца ў жыцьці горада і края? Гэтае пытаньне зноў і зноў задаеш сабе кожнага разу, шукаючы пра старажытнасьць ці пра нашаніўскую пару ці пра беларускую актыўнасьць міжваеннага часу, але бачачы пры тым навокал зусім іншы абраз. Нешта панішчыла пілсудчына? Глябальнае вынішчэньне пасьля 17 верасьня 1939 году правялі Саветы? Потым вайна.. У мінулым нумары *НН* пра тыя часы распавяла Зоя Каўшанка. Але ж і ў вайну пэўныя рэшткі беларускае актыўнасьці праяўлялі сябе ў Вільні. Найбагатшы нацыянальны музэй — Віленскі беларускі музэй імя Івана Луцкевіча, традыцыі нацыянальнай школы — Віленская беларуская гімназія, вялізнае мноства беларускіх суполак, так і не паўтораная ў наступныя гады нацыянальная школа журналістыкі — сотні віленскіх беларускіх газэт. Ня можа быць, каб палякі, расейцы й немцы за некалькі гадоў зьнішчылі ўсё гэта. Нечага ў такой тёгіцы ўсе ж бракуе. І гэтае нешта — сьведчаньні людзей, якія былі ў Вільні ў той паваенны час. Адно такое сьведчаньне апублікавау 1 сьнежня 1946 году ў сваім № 11 беларускі часопіс *Шляхам Жыцьця*, які выходзіў у Нямеччыне, у Ватэнштэце

Пад такім загалоўкам газэта Dziennik Polski i Dziennik Żołnierza» зьмясьціла ў № 262 артыкул. Дзеля яго цікавасьці падаем яго у перакладзе

Да Нямеччыны у апошнія гады уцек віленчук, які да канца верасьня г.г. пражываў у Віленшчыне. Вось жменька вестак які атрыманы ад яго

Вільня прадстаўляе сяньня вельмі жаласны абразок. Паважна зьнішчаная ў часе баёў, а асабліва праз адступаючых немцаў яна не падымаецца з свайго ўпадку, ня гледзячы на тое, што фармальна зьяўляецца сталіцаю «Літоўскай Савецкай Рэспублікі» Літоўскасьць Вільні урэшце і далей ёсьць нечым зусім тэарэтычным бо ўсеўладна ўсюды ўрадуюць расейцы Ня толькі Вільня, але ўся Віленшчына і Літва перапоўнены савецкімі войскамі. Савецкія войскі разьмешчаны нават па маленькіх вёсках і хутарох З вуліцаў Вільні да гэтае пары у многіх мейсцах ня зьвезены грузы Трагічны абразок уяўляюць Віленская і Нямецкая вуліцы Вуліца Міцкевіча (цяпер Гэдыміна) — таксама мае вялікія шчэрбіны Сярод разбураных дамоў на вул. Міцкевіча знаходзіцца новы гмах Дзяржаўнае Касы ашчаднасьці Няма Чырвонага Штраля і готэлю Жоржа З цукерняу асталіся толькі цукерня Рудніцкага і Зялёны Штраль. Там можна дастаць кепскую каву і цестачкі; дзеля таго, што гэта, аднак цукерні «І клясы» — мясцовае жыхарства староніцца іх падобна як і рэстаранаў «першае клясы», якімі зьяўляюцца «Брыстоль», «Зацішша», заўсёды поўныя савецкіх афіцэраў і ўрадоўцаў НКВД

Віленскія касьцелы памінаючы касьцёл сьв. Казіміра агулам уцалелі Віленская катэдра непашкоджана Артылерыйскі снарад зьбіў толькі на аднэй з фігураў, якія стаяць па абедзьвюх старонах крыжа над увахадам у катэдру, галаву У Вострай Браме як раней перад Цудоўным абразом Маці Божае адпраўляюцца службы Божыя. Вострабрамская вуліца пастарому перапоўнена вернікамі.

15 тысяч палякоў

Жыхары Вільні — бяз розьніцы палякі і ліцьвіны — блізу нічым ужо не напамінаюць эўрапэйцаў Элегант на апранутых людзей няма Як вопратка — пераважна спатыкаюцца ватоўкі і «фуфайкі» або марынаркі з самадзелу. Скураны абутак заменены валенкамі з гумовым падбіцьцём Жанчыны як правіла, носяць хусткі Кожны чалавек, які адрозьніваецца лепшай вопраткай, наражаецца на кантроль дакумантаў міліцыяй Вельмі характарыстычным ёсьць тое, што на вуліцах Вільні не відаць моладзі. Пераважна можна спаткаць старэйшых людзей або дзяцей Віленская моладзь зьнікла адразу

Агулам трэба лічыць, што ў Вільні асталося ня больш як 15.000 палякоў, пераважна людзей у старэйшым веку. Ёсьць яшчэ таксама пару дзесяткаў польскіх ксяндзоў, лічба якіх з дня на дзень зьмяншаецца. Хто з палякоў мог выехаць у заходнюю Польшчу — выехаў. Былі вёскі, якія цалкам хацелі выехаць, а сярод іх <u>вёскі выключна з беларускім насельніцтвам</u>. На пачатку гэтыя выезды ў Польшчу адбываліся без вялікіх перашкодаў, аднак, з часам НКВД пачало рабіць перашкоды. Абвешчана было, што выяжджаць могуць толькі тыя, хто ўплаціў усе падаткі потым хто аплаціў усе падаткі і здаў усе патрэбныя кантынгэнты збожжа і гароднiны Такім чынам стварылася нешта падобнае да квадратуры кола. Той, хто аплаціў падаткі, ня здаў яшчэ збожжа, хто здаў збожжа павінен быў ужо плаціць новыя падаткі <u>Беларускае насельніцтва, якое хацела выехаць у большасьці вывезена ў глыб Расеі</u>

Прысланыя з Варшавы шэфы «Польскай Місіі Рэпатрыяцыйнай» таксама не далі сабе рады з НКВД. Першы шэф Місіі Рэпатрыяцыйнай і «паўнамоцнік ураду Р.П.» Ахоцкі - быў у Вільні арыштаваны (!) і засуджаны на 15 гадоў турмы. Праўда, урад п. Осубкі нават не інтэрвэньяваў у справе свайго паўнамоцніка. На месца Ахоцкага прыехаў з Варшавы нейкі п Урняш, які пасьля двух тыдняў побыту ўцёк назад у Польшчу. Трэці, таксама назначаны дырэктарам Польскага Чырвонага Крыжа ў Вільні — Каліцкі, таксама ўцёк і перабраўся праз граніцу пры дапамозе аднаго з польскіх лясных аддзелаў, укамплектаванага з моладзі, якая сотнямі хаваецца ў лясох. Нарэшце, апошні дэлегат «ураду Р П.» — Лішнскі — адмовіўся адразу па прыезьдзе ў Вільню ад свайго становішча і якнайхутчэй вярнуўся ў Варшаву.

Саланіна і шампанскае

Ня гледзячы на прамысловую прадпрыемлівасьць і гаспадарнасьць ліцьвіноў, — Вільня галадае. Ані ў Вільні, ані у Коўне няма ніводнае большае прыватнае крамы. У бочных вулачках часам яшчэ можна знайсьці сякія-такія маленькія крамкі, але яны раней ці пазьней будуць зачынены

Галоўным магазынам для ўсіх у Вільні зьяўляецца дзяржаўны «Гастраном» пры вуліцы Міцкевіча. У гэтым магазыне можна купляць усім, але не для ўсіх аднолькава разьмеркаваныя цэны. Савецкія афіцэры, вышэйшыя ўрадоўцы і энкаведысты карыстаюцца са зьніжак. Для энкаведыстаў зьніжкі даходзяць да 90 працэнтаў прадажнай цаны. Урадоўцы маюць сталыя, гэтак званыя «лимитные карточки». Наадварот, работнікі ў «бацькаўшчыне людзей працы» ня маюць ніякіх зьніжак Плата выкваліфікаванага работніка у месяц выносіць 500 рублёў. Цэны ў «Гастраноме» ж такія: кг. цукру — 100 руб. кг саланіны — 140 руб., кг. мяса — 40 руб., піражок — 8 руб. Невядома чаму, «Гастраном» папросту завалены дактылямі. Кілёграм дактыляў каштуе 270 руб. Поўна таксама і шампанскага. Бутэлька шампанскага каштуе 25 руб., бо толькі у капіталістычных краінах шампанскае для буржуяў. У Расеі работнік мае права да таннага шампанскага

Вольныя ліцьвіны і НКВД

Цэлая Вільня Віленшчына і Літва дрыжаць перад савецкім тэрорам. Ахвярамі гэтага тэрору пераважна **зьяўляюцца ліцьвіны Бо палякоў ас**талося ўжо мала Гэта становча ўплыло на зьмену адносінаў ліцьвіноў да палякоў. Ліцьвіны горнуцца да палякоў і у кожнай гутарцы падчырківаюць што без праўдзівай і незалежнай Польшчы — ня будзе Літвы. Літва гіне, а яе народ масава вывозіцца ў Расею. Хто выразна не дэкляруе свайго становішча, хто дэманстрацыйна не падчырківае свае лёяльнасьці да марыянэткі — Палецкіса, раней ці пазьней згіне. На астатку быў арыштаваны і вывезены ў Сібір былы прэм'ер Літвы вядомы кс Міронас

Літоўская моладзь масава ўцякае ў лясы

Мой інфарматар цьвердзіць што літоўскія партызаны вельмі лічныя і добра зарганізаваныя Лясная партызанка супрацоўнічае з латыскаю і эстонскаю партызанкаю. У лясох Віленшчыны хаваюцца аддзелы т зв «Вольных Ліцьвіноў».

«Вольных Ліцьвіноў», калі іх зловіць НКВД, — жорстка мардуюць. Трупы забітых, як правіла, складаюцца ў вёсках і мястэчках на відным месцы. У апошнія часы ў Аліце дзесяць дзён ляжалі трупы 40 ліцьвіноў. Іх забралі калі яны дашчэнту раскладаліся.

Гэта ёсьць змаганьне на сьмерць і на жыцьцё. Ліцьвіны цьвердзяць, што другога выбару для іх няма. Яны адказваюць забойствам за забойства нішчаць меншыя аддзелы і савецкія патрулі. Вільня пры гэткай сытуацыі зрабілася велізарным цэнтрам НКВД на балтыцкія краіны 80 найбольшых дамоў Вільні займае НКВД. Усюды падвалы перапоўнены арыштаванымі

Такая сапраўднасьць Вільні і Віленшчыны

Рышард Керсноускі



Зьмітрок Фалькоўскі



* * *

Дваццаты дзень змарнелыя ішлі,
Пытаючы дарогу, навабранцы
На раньнім сонцы зіхацелі глянцам
Пустыя ранцы іх і пасталы
Зялёны чэрвень засьцілаў сталы
І ўмомант зьніклі бліндажы і шанцы,
Далёкія агні далёкіх станцый
Дзе столькі год у злыднях пражылі.
Праз доўгі час зьняверанья и нявол
Жыила іх апошняя з надзей,
Што калі-небудзь прыйдзе лепшы дзень,
Калі, няхай бяз хлеба і бяз солі,
Зь іх кожны зноў разору праўдзе
Бліскучым плугам па знаёмым полі.

1927



Гіём Апалінэр



Адначасовасьці

У цямночы гарматаў пальба
Быццам хвалі разьятраных сэрцаў
Дзе вялікая сьпее журба
Ад якое нікуды ня дзецца

Паглядае яна з-пад рукі
На прываблу часоў недасяжных
Ў гэтым громе вялікім які
Над зямлею расьце незаўважна

Вунь яна зьняўшы каску ўспамін
Пра лілею вітае пра ружу
Пра квітучы за Сенай язьмін
Што пялёсткі на сьцежкі цярушыць

І пад каскаи яна ўсе адно
Валасоў хвалі цёмныя мроіць
Той што ўжо не чакае даўно
О лілёвасьць вялікага мора

Спарышы прыгажосьці зь ляшчын
Марна вас абівае Шал гэткі
Тых сініц што ў цябе на плячы
Пераззовы зьвіняць для брунэткі

Наша любасьць прамень Напрасткі
Ён з пражэктара сэрцаў шыбае
Да нязгаснага палу які
Вышыні маяка дасягае

О маяк маіх згадак О дым
Чорны дым валасоў Магдалены
Бляскі стрэлаў у змроку начным
Дадаюць сваю сьветласьць нязьменна
Тваім пекным вачам Магдалена.

Адам Міцкевіч



Сьмерць палкоўніка

У глухім гушчары перад плотам
Лесьнічоўкі старой стала рота,
А ў дзьвярох стаіць бледны ахоўнік —
Там, у хатцы, канае Палкоўнік
Зь весак зьбегліся людзі: няйначай
Быў вялікай ён моцы і славы,
Калі так просты люд па ім плача
Й пра здароўе пытае, цікаўны
Загадаў асядлаць наастачу
Ён каня — і ў пакой яго ўводзяць,
Каб шчэ раз ён таварыша ўбачыў,
Неабходнага ў кожнай прыгодзе
Загадаў даць мундур свой стралецкі,
І штылет свой, і пас, і ладункі,
Вои стары — хоча ён, як Чарнецкі,
Перад сконам зірнуць на рыштункі.


Пасьля розьвітаў гэтых у дзьверы
Ксёндз вясковы ўвайшоў з П[illegible] Богам,
І ад жалю зьбялелі жаўнеры
І ўсе ўкленчылі перад парогам
Нават вои Касьцюшкі, што ў бітвах
Сто разоў сваю кроў пралівалі
Без адзінай сьлязы — не стрывалі
І ў сьлязох паўтаралі малітвы

У капліцы біў звон на сьвітаньні,
Кінуць хату стральцам давялося,
Бо маскаль у ваколіцы гойсаў
Увайшлі да героя сяляне
Ён ляжаў у куце на тапчане —
У руках сьвяты крыж, а пры боку
Яго верныя нож, дубальтоўка.

Але хоць і ў жаўнерскім убраньні,
Быў у лыцара твар надта гожы
І высокія грудзі.. Ах, Божа,
Там дзяўчына, ліцьвінка была там,
Каманьдзерка — Эмілія Плятэр!

1832

Пераклаў з украінскае французскае й польскае А М



Хорхэ Луіс Борхэс

РУЖА ПАРАЦЭЛЬСА

La Rosa de Paracelso De Quincey Writings, XIII, 345

У сваёй майстэрні, што займала два пакоі ў склепе, Парацэльс маліў свайго Бога, свайго невымоўнага Бога, хоць нейкага Бога, каб той паслаў яму вучня Вечарэла Убогае полымя каміну кідала хісткія цені на сьцены Надмерным высілкам было ўстаць і запаліць жалезную лямпу. Зможаны стомаю, Парацэльс забыўся пра свае малеиьне. Ноч ужо ахінула запыленыя алембікі й шкляныя рукі, калі нехта пагрукаў у дзьверы Прыснулы гаспадар устаў, падняўся кароткай кручанай лесьвіцай і расчыніў палавінку дзьвярэй. Увайшоў незнаёмы Ён таксама быў вельмі стомлены Парацэльс паказаў яму на лаву; той сеў і сьцішыўся ў чаканьні Нейкі час абодва маўчалі.

Майстар загаварыў першы

— Я памятаю твары Захаду й твары Ўсходу, — сказаў ён самавіта. — Твайго ня памятаю Хто ты такі й чаго ад мяне хочаш?

— Мае имя нічога табе ня скажа, — адказаў той — Тры дні й тры ночы вандраваў я, каб увайсьці ў твой дом Я хачу быць тваім вучнем Аддаю табе усё, што маю

Ён дастаў вузкі даўгі ворак і перакуліў яго на стол. Манэтаў было шмат, і яны былі залатыя Ён зрабіў гэта правай рукою. Парацэльс быў адвярнуўся, каб запаліць лямпу Павярнуўшыся, ён заўважыў, што ў левай руцэ незнаёмы трымае ружу Ружа яго зьдзівіла

Ён аблегся ў фатэлі й сказаў, склаўшы пальцы

— Ты лічыш, што я здольны вынайсьці камень, які ператварае ўсе рэчывы ў золата і прапануеш мне золата Я ня золата шукаю, і калі цябе абыходзіць золата, ты ніколі ня будзеш маім вучнем.

— Золата мяне не абыходзіць — адказаў той — Гэтыя манэты — толькі зарука майго жаданьня працаваць Я хачу, каб ты навучыў мяне Мастацтву Хачу прайсьці побач з табою шлях, што вядзе да Каменя

Парацэльс адказаў павольна

— Шлях — гэта Камень Зыходны пункт — гэта Камень Калі ты не разумееш гэтыя словы, дык ты яшчэ не пачаў разумець Кожны зроблены крок — гэта мэта

Незнаемы паглядзеў на яго недаверліва и спытаўся выразным голасам

— А ці есьць увогуле мэта?

Парацэльс засьмяяўся

— Тыя, што ганяць мяне, а дурасьць іхная ня меншая за іх колькасьць, кажуць, што яе няма, і называюць мяне ашуканцам. Я зь імі ня згодны, але магчыма я й памыляюся Я ведаю, што «ёсьць» Шлях

Яны памаўчалі, тады незнаемы сказаў

— Я гатовы прайсьці яго з табою, хай бы нам і давялося йсьці доўгія гады. Дазволь мне глянуць хоць бы здалёк на сьвятую зямлю, хай бы зоркі й не наканавалі мне у яе ступіць Хачу толькі нейкага доказу, перш чым выправіцца ў шлях

(Працяг на старонцы 10)

Гамсахурдзія — наш чалавек

Уладзімер Арлоў

На плоце наклеены нясьвежы нумар газэты «Правда». Друкаваны орган прыпыненай партыі абураецца, што мумію правадыра хочуць вынесьці з маўзалею й па-хрысьціянску аддаць зямлі побач з магілаю маці. Аргументы па-бальшавіцку грунтоўныя: вось памруць, маўляў, Міхаіл Сяргеевіч з Раісай Максімаўнай, і заманецца некаму пахаваць іх на Стаўрапольшчыне, каля магілы маці былога генсека... Між тым, прэзыдэнт не вылазіць з тэлевізара, прэзыдэньціха ўчора паведамляла народу, што «передвижники внесли большой вклад в искусство», а прэзыдэнтава маці днямі яшчэ сядзела на лавачцы пры сваёй сьціплай стаўрапольскай хаціны, казала тэлегледачам, што Міша быў актыўны камсамолец, і таксама паміраць нібыта не зьбіраецца.



А можа, «Правда» цешыць сябе Карпацкім, думай, што хочаш.

Побач з газэтнаю маглясцінаю абвестка, з 30-га паветраная пакладка ў аэрапорт хадзіць на ... сувязі з паломкаю. А сёньня толькі 28-га. Акуль ведома, што аўтобус праз дзень ... маршрутка на ... сабакаю.

Але ўсё гэта драбяза. Вось праблема, вартая інтэлігентнага мужчыны: дзе я знаходжуся?

Вакол кіпарысы, горы, жанчыны і гандлёвыя кропкі Абхаскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якая ўваходзіць у склад СССР. Але адначасова яна ўваходзіць і ў Рэспубліку Грузію, якая ў СССР не ўваходзіць.

Ёсьць толькі адзін спосаб даведацца тут нейкага сэнсу. Яго завуць Бора Гальперашвілі. Гэты абхаскі жыд, здаецца, ніколі ня быў ні акцябронкам, ні піянэрам, не вучыўся ні ў школе ні ў ВНУ, а ад нараджэньня, паблісквючы заплылымі тлушчам разумнымі вочкамі, стаяў за стойкаю аднаго з прыморскіх піцундзкіх бараў зь непрэтэнцыёзнаю назваю «Бар».

З Борам мы пазнаёміліся яшчэ на досьвітку перабудовы, калі аднойчы так заўзята падтрымлівалі дэмакратычныя працэсы, што потым давялося падтрымліваць нас. Тады, памятаецца, пляшка цынандалі каштавала ў «Бары» два рублі, а гарачы сакаўны хачапуры — сорак капеек.

Час не спрыяе чульлівасьці, і мы з Борам сустракаемся па-мужчынску стрымана. Паміж намі адбываецца першы дыялёг.

— Господин Боря, — кажу я, — измождённый организм жаждет бутылочку цинандали и один хачапури.

— А что, дорогой, — пытаецца «господин Боря», — Белоруссия тоже отделилась?

— А как же, — адказваю я, падазрона пазіраючы на загадзя адкаркаваную пляшку без налепкі, а потым на Бору. Спакойна вытрымаўшы мой позірк, Бора цікавіцца:

— А какая у вас будет валюта?

— Драньки и майсюки, — не змаргнуўшы, адказваю я.

— Интересные названия, — з павагаю кажа Бора.

— Причем в одном драньке будет 99 майсюков, — помсьліва дадаю я.

Бора настолькі ўражаны складанасьцю нашай грашовай сістэмы, што хавае адкаркаваную пляшку без апазнавальных знакаў і адкаркоўвае новую з налепкай.

— А почему 99, а не 100?

— Потому что один уже есть.

Гэта мая дробная помста за таямніцу Абхаскай ССР. Няхай ведае, што й мы не ў рэшаце яешню смажым.

З пляшкаю залацістага цынандалі за восем рублёў, з хачапуры амаль бяз сыру і бяз масла, загоем за граўчку, і з філіжанкаю з адбітым вушкам (шклянкі ў Абх.ССР ці ў незалежнай РГ ужо скончыліся) я іду да мора й выбіраю сабе абгладжанае хвалямі і выкінутае ўрэшце на бераг бервяно.

Шторм быў учора. Сёньня зялёныя хвалі ласкава ліжуць бераг. Раз-пораз пеньлівы язык мора дастае да самага бервяна. Тады камяньчыкі ўспыхваюць і пераліваюцца рознымі колерамі ды хутка зноў робяцца шаравата-аднатонныя і толькі рэдкі зь іх не губляе сваё барвы.

Зьверху грэе сонца, зьсярэдзіны — цынандалі, зьнізу — утульнае цёплае бервяно. Магчыма, яго кінулі ў хвалі турэцкія працоўныя, каб дапамагчы працоўным незалежнае РГ (ці Абх ССР) пераадолець энэргетычны крызіс, які змушае на ўсім гэтым абшары (незалежна ад уваходжаньня ці неўваходжаньня ў СССР) з 12-ці да 17-ці вырубаць электрычнасьць.

Але выпіць першую філіжанку за турэцкіх працоўных я не магу. Бо ў такім разе мне ніколі не даруе беларускі паэт, прозьвішча якога я беспардонна выкарыстаў у размове з Борам Гальперашвілі.

Першыя глыткі я п'ю за Лёню Дранько-Майсюка. Цяпер мяне грэе ня толькі сонца, бервяно і цынандалі, але і ўспамін пра Лёню. Гэта ён, Лёня, напісаў мне на сваёй апошняй кніжцы аўтограф:

Валодзя, дружа, жарты — жартамі,
Ды трэба і гэткага чакаць,
Што будзем хутка з парыжанкамі
Па-беларуску размаўляць.

Я ня супраць. Праўда, парыжанак мне хочацца замяніць на філіжанкі. Тады атрымаецца больш сьціпла і бліжэй да жыцьця...

Палітыка на гэтай блаславёнай зямлі пры сутнічае сёньня ва ўсім, нават у цынандалі.

Калі я п'ю за здароўе турэцкіх працоўных, імя Леаніда Васілевіча Дранько-Майсюка ў маёй сьвядомасьці ўжо цалкам выцесьненае іншым — Зьвіяд Канстанцінавіч Гамсахурдзія.

Калісьці ён змагаўся за правы чалавека, яго садзілі, ён нібыта каяўся, выходзіў на волю, зьбіраў дэманстрацыю й вёў яе да Мцхецкага храму. Насустрач Зьвіяду Канстанцінавічу выяжджаў Эдуард Амвросіевіч Шэварднадзэ, як сеўшы ў крэсла першага сакратара грузінскага ЦК, перасаджаў, кажуць, 30 тысяч гэтак званых спэкулянтаў і цэневікоў, за правы якіх, пазываючы іх прадпрымальнікамі, ваюе цяпер у «Движении демократических реформ».

А тады верны ленінец, брэжневец і андропавец Шэварднадзэ, раскрыліўшы рукі, ішоў насустрач дэманстрантам.

— Чаго ты хочаш, сынок? — пытаўся ён у Гамсахурдзіі, спрабуючы абняць яго.

— Нікі я табе не сынок, — хмурна абзываўся сын клясыка грузінскае літаратуры дысыдэнт Зьвіяд. — У мяне адна маці — Грузія, і ты яе прадаў.

Гамсахурдзію зноў садзілі і ўсё паўтаралася.

Пра гэта распавядаў мне гадоў дзесяць таму знаёмы грузінскі мастак — паміж злоснай антысавецкаю показкай пра тое, як Брэжнева вадзілі па Эрмітажы (Вось, Леанід Ільіч, Гоя, а вось «Дзяўчынка на шары» Пікаса. — А гэта што за малпа? — А гэта, Леанід Ільіч, люстэрка. — А-а, Таркоўскі...), і блюзьнерскай показкай пра тое, як Гіві намаляваў мадонну, аднак «слишком балшой малчык палучился».

Першая пляшка цынандалі, як і часіны застою, калі яна каштавала ня больш за два рублі, ужо сталася гісторыяй.

У Боры бяруць марозіва салдацікі Савецкай армii. Лыжачкі ў Абх. ССР (ці ў незалежнай РГ) ужо скончыліся, і Бора падае марозіва зь відэльцамі. Воддаль спыняецца машына з трыма грузінскімі гвардзейцамі, і паміж мною і Борам адбываецца другі дыялёг.

— Боря, ты хотел бы служить в национальной гвардии?

— ... национальная гвардия и — вытанчана й прыгожа лаецца Бора.

— Боря, а в Советской армии ты служил?

— Советская и... армия и — Бора лаецца непрыгожа й нявытанчана.

Вяртаючыся да бервяна, я знарок раблю кругаля, каб прайсьці побач з нацыянальнымі гвардзейцамі й падараваць аднаму зь іх бел-чырвона-белы значак.

— Ты за Гамсахурдиа? — замест якога-небудзь значка наўзамен, пытаецца гвардзеец, і тры пары цёмных вачэй глядзяць на мяне, нібыта тры дубальтоўкі.

— Я за демократию, — абачліва адказваю я пад гэтымі трыма сэктарамі абстрэлу.

— Проходи, — кажа гвардзеец.

Цынандалі з новае пляшкі пераконвае, што вадаправод у «Бары» з 12-ці да 17-ці пакуль што не адключаюць.

Бервяно, мора і цынандалі зноў скіроўваюць мае думкі да загадкі — дзе я знаходжуся? — і да асобы, якая гэтую загадку ўвасабляе.

Чарговая пабыўка Гамсахурдзіі на волі атрымалася такая працяглая, што дысідэнт здолеў ператварыцца ў прэзыдэнта.

Народ любіць свайго прэзыдэнта батона Зьвіяда Гамсахурдзію. Ніякага сумневу ў гэтым не пакідае ўчарашні нумар «Вечернего Тбилиси», што тырчыць у мяне зь кішэні. «Напрасно враги Грузии, — напісана ў ім на першай старонцы, — тешат себя надеждой, что наш народ устал в борьбе за независимость и демократию. Он неутомим, как и его Президент. Проискам врагов мы противопоставим сплоченность и единство. Те же, кто выступает против народа, будут сурово наказаны».

Ад гэтых суворых слоў лёгкі хмель пакідае мяне, і я пасьпешліва напаўняю філіжанку, каб адгнацца ад халоднае думкі: ці не выступаю я супраць народа, што супрацьпаставіць мне сваю згуртаванасьць і адзінства.

З газэтнае паласы на мяне дапытліва глядзіць

РУЖА ПАРАЦЭЛЬСА

(Працяг са старонкі 9)

— Калі? — неспакойна спытаўся Парацэльс.

— Зараз жа, — адказаў з раптоўнай рашучасьцю вучань.

Яны пачыналі размову на лацінe, цяпер гаварылі па-нямецку.

Юнак узьняў перад сабою ружу.

— Кажуць, — сказаў ён, — што ты можаш спаліць ружу і ўваскрасіць яе з попелу сваім мастацтвам. Дазволь мне быць сьведкам гэтага цуду. Гэтага прашу ў цябе і пасьля аддам табе ўсё маё жыцьцё.

— Ты быў занадта даверлівы, — адказаў майстар. — Мне не патрэбная даверлівасьць; я патрабую веру.

Вучань заўпарціўся.

— Якраз таму, што я зусім не даверлівы, я хачу бачыць на ўласныя вочы зьнішчэньне і ўваскрашэньне ружы.

Парацэльс быў узяў яе й забаўляўся зь ёю.

— Ты даверлівы, — сказаў ён. — Кажаш, што я здольны яе зьнішчыць?

— Няма таго, хто быў бы няздольны яе зьнішчыць, — адказаў вучань.

— Ты памыляешся. Ты думаеш, магчыма, што нешта можа быць вернутае ў нішто? Думаеш, што першы Адам у Раі мог зьнішчыць хоць бы адну кветку ці былінку?

— Мы ня ў Раі, — упарта адказаў юнак, — тут, пад месяцовым сьвятлом, усё сьмяротнае.

Парацэльс устаў.

— А дзе ж мы яшчэ? Ты думаеш, што боскі розум можа стварыць нешта такое, што не было б Раем? Думаеш, што Падзеньне — гэта штосьці іншае, як проста няведаньне таго, што мы ў Раі?

— Ружа можа згарэць, — зацята адказаў вучань.

— У каміне яшчэ ёсьць крыху агню, — сказаў Парацэльс. — Калі ты кінеш гэтую ружу ў прысак, дык паверыш, што ён яе спаліць і што попел будзе сапраўдны. А я кажу табе, што ружа вечная і толькі выгляд яе можа мяняцца. Аднаго майго слова было б даволі, каб ты зноў пабачыў яе.

— Аднаго слова? — зьдзівіўся вучань. — Твае прылады ня дзеяць, алембікі поўныя пылу. Што ты маеш, каб яе уваскрасіць?

Парацэльс паглядзеў на яго са смуткам.

— Прылады ня дзеяць, — паўтарыў ён, — і алембікі поўныя пылу. У гэтую часіну майго доўгага дня я ўжываю іншыя інструманты.

— Не наважваюся запытацца, якія, — сказаў вучань ці то з хітрасьцю, ці то з пакораю.

— Я кажу пра тое, што ўжываў боскі розум, каб стварыць нябёсы й зямлю и нябачны Рай, у якім мы ёсьць, і

дарагі батона прэзыдэнт. «Хаи смутак ніколі ня росіць вачэй тваіх добрых і ясных» — выплываюць на памяць словы зь ліста беларускага народу да вусатага суайчыньніка дарагога батона прэзыдэнта

Тамсама на першай старонцы пад партрэтам дарагога падвярстаны ліст армянаў, якія дзякуюць «и лично дорогому президенту» за адкрыцьце ў грузінскай школе армянскае клясы

Учора ўвечары, калі далі электрычнасьць, па першай праграме TV паведамілі, што ў Тбілісі за арганізацыю забастоўкі арыштавалі старшыню грузінскага дзяржтэлерадыё і яшчэ дзевяць апазіцыянэраў Тэлежурналісты па-ранейшаму бастуюць, і па тбіліскай праграме ідуць адно інфармацыйныя выпускі і амэрыканскія баявікі. У вечаровым выпуску паказваюць мітынг. На ім выступаюць. прыгожая жанчына ў чорных панчохах, непрыгожая жанчына ў чорных панчохах і з вусамі, неінтэлігентны мужчына ў чорных акулярах з падазрона аттутураным крысом пінжака і сам батона прэзыдэнт Ён чыста выгалены, але ўсе адно цяжка пазбыцца моцных асацыяцый з фідэлеўскай смаляной барадою Над натоўпам падымаецца збой партрэтаў дарагога батона.

Пасьля інфармацыйнага выпуску круцяць вэстэрн пра індзейцаў, які, мусіць, нідзе апрача Абх ССР (ці незалежнай РГ), ня ўбачыш.

Фільм ідзе па-ангельску унізе паўзуць гіярогліфы японскіх субтытраў, за кадрам гучыць пераклад то на грузінскую, то на расейскую, то на нейкую зусім незнаёмую мову. Напэўна паказ наладжаны адмыслова дзеля дарагога прэзыдэнта які ведае зь дзесятак моваў

З боку Турцыі хвалі павольна падганяюць два бервяны й яшчэ нешта незразумелае

Яшчэ адна філіжанка за туркаў і неўпрыкмет я апынаюся ў смузе колеру разбаўленага цынандалі. У ёй пачынае вымалёўвацца нейкая высnова. Вось зараз я ўхаплю яе за хвост але

Але ў гэтай залаціста-празрыстай смузе — быццам кагадзе сыйшоў з тэлеэкрану — па пляжы сунецца ў белых штанах генэрал КГБ Алег Данілавіч Калугін. Ён без накладной барады і чорных акуляраў і відавочна не падобны да зацкаванага людзьмі Гамсахурдзіі агента (хай сабе і адстаўнога) варожай дзяржавы. Значыцца, я ўсё ж у Абх. ССР

— Господин Калугин! — гукаю я падымаючыся зь бервяна.

Ён ня ўздрыгвае і не палохаецца. Здаецца яму нават прыемна, што яго пазналі. Генэрал стаміўся безь вядомасьці ваюючы на таемных франтах барацьбы зь імпэрыялізмам



— Г н Калугин! Интервью для белорусской газеты «Наша Ніва»! Первый вопрос Вы прибыли сюда в качестве агента Кремля?

Генэрал абмярае нахабу ліпуча-чэпкім позіркам і дастае з кішэні асадку «паркер» Мяне праціnае: вось стрэліць зараз якой небудзь атрутнаи стралой

— Так вы из Минска? — Ён хавае «паркер» у кішэню. — Что-то вы не очень похожи на белоруса

Ніякіх дакумантаў у мяне з сабою няма, і замест іх я пачынаю чытаць генэралу верш Рыгора Іванавіча Барадуліна:

Трэба дома бываць часьцеи
Трэба дома бываць ня госьцем

— Это намек? — пытаецца пільны спадар Калугін

Я прапаную яму разбаўленага цынандалі

маўляецца Магчыма, прычына ў тым. што філіжанка ў мяне адна, а йсьці да Боры па другую ня хочацца. Банальная ідэя наконт інтэрвію ўжо пакінула мяне.

імя Боры Гальперашвілі. Генэрал ад-
Ну, пайшоў ён у органы адразу пасьля філфаку Ленінградзкага унівэрсытэту (ці не пастукваў, як быў студэнтам?). Ну, сядзеў на «дыпляматычна-журналісцкай» пасадзе ў ЗША, закупляючы рэдактараў эміграцкіх выданьняў. Ну, выдаваў пад псэўдонімам «О.Кедров» свае кніжкі, дзе выкрываў акулаў капіталістычнага сьвету Ну ажаніўся зь Людмілай Віктараўнай (яна ўжо зьявілася на даляглядзе й занепакоена набліжаецца да нас у штанах колеру бэж). Ну працуе яна скончыўшы пэдынстытут, у інстытуце ЗША і Канады. (Мы й так ведаем, што якраз у пэдынстытутах і рыхтуюць гэткіх спэцыялістаў) Усё гэта неістотна

Новую філіжанку я п'ю за генэрала Калугіна, найлепшага з усіх прадстаўнікоў ягонага ведамства, якіх я дагэтуль ведаў. Ён не паказваў мне сваёй корачкі, не выклікаў мяне ў бюро пропускоў, не казаў пра «нагнетание националистических страстей в некоторых рассказах» Урэшце, нават апазнаў не ён мяне, а я яго.

За вас генэрал!

Людміла Віктараўна таксама адмаўляецца ад цынандалі, і яны аддаляюцца ўздоўж шампаністага прыбою Іхні ўлюбёны адпачынак — дваццацікілямэтровая прыморская прагулянка

За вас Алег Данілавіч і Людміла Віктараўна!

Як кажуць у вас у Расеі скатертью дорога!

Я гляджу на мора. Таямнічая рэч, якую несьлі хвалі, ужо блізка. Гэта абшарпанае драўлянае крэсла. Напэўна, яго таксама прыслалі турэцкія пралетары, прачытаўшы ў газэце, што ў нас крызіс з мэбляю. Я выцягваю аблупленае крэсла з вады і кладу яго на жвір сушыць

У яго толькі тры нагі, але на ім можна сядзець што я и раблю, дапіваючы за турэцкіх пралетараў апошнія глыткі. На ўсялякі выпадак я пералічваю грошы і гляджу на Бору. Крэсла, як быццам прадчуваючы хуткае расстаньне назусім, ня хоча адпускаць мяне

Паміж мною і Борам адбываецца трэйці дыялёг.

— Кто этот человек? — ен ківае ў той бок куды пайшоў генэрал

— Это Калугин — адказваю я — Ну тот генерал КГБ

— и... КГБ — кажа Бора

За час, пакуль я гаварыў з генэралам і сушыў турэцкае крэсла у «Бары» прычынілася падвышэньне коштаў на цынандалі і на хачапуры, аднак мне, як старому кліенту, Бора адпускае яшчэ па старым кошце Ягоны позірк раптам робіцца загадкавы і скіраваны некуды паўзьверх майго пляча.

Я адварочваюся ад стойкі і бачу побач са сваім крэслам нейкага чалавека.

— Эй! — вясёла крычыць ен — Это твоя стула?

— Моя!

— Можно я заберу?

Нельзя!
— Спасибо! — крычыць незнаемы грамадзянін Абх. ССР (ці незалежнай РГ), пасылае мне пераможны позірк і прытуліўшы да грудзей турэцкае крэсла, шпаркай ступою кіруецца ў кіпарысавыя прысады

На шчасьце захапіць з сабою мае цеплае бервяно ён ня здолеў. Я прыхінаюся да яго, расьсьцілаю газэту «Вечерний Тбилиси», кладу побач з партрэтам Гамсахурдзіі свой трэйці хачапуры, дзякую Бору і асабіста дарагому прэзыдэнту і пагружаюся ў залацістую смугу

Перада мною мора, усьцяж якога шпацырує генэрал Калугін. За мною горы за якімі сядзіць генэрал Дудаеў. Галаваломнае пытаньне Абх. ССР і незалежнае РГ абрастае новымі варыяцыямі: Грузія ўваходзіць у Абхазію, СССР выходзіць з Грузіі, я выходжу з СССР, СССР выходзіць зь мяне

Чамусьці ад усяго гэтага мяне наведвае востры прыступ самоты. Сьвет здаецца страшэнна няпэўным і крохкім. Ён гатовы абрынуцца на мяне і пахаваць пад сваімі руінамі. Шукаючы духоўнага апірышча я гляджу на філіжанку з адбітым вушкам. Яшчэ імгненьне, і ад роспачы я загавару зь ёю па беларуску, спраўдзіўшы адрэдагаванае абяцаньне Лёні Дранько-Майсюка.

І тут з залацістае смугі прыходзіць паратунак З гэтае смугі колеру разбаўленага цынандалі імя Боры Гальперашвілі выплывае высnова, якая ўкладваецца ў тры словы Гамсахурдзія — наш чалавек

Каб не забыцца, я пішу іх на вільготным пяску буйнымі літарамі:

ГАМСАХУРДЗІЯ — НАШ ЧАЛАВЕК

Праз хвіліну мне здаецца, што гэта ня надта патрыятычна, і побач я дапісваю

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!

Сьвет вакол мяне зноў набывае ўстойлівасьць і надзейнасьць

— Гамсахурдзія — наш чалавек — уголас прамаўляю я дажоўваючы апошні кавалак гумовага хачапуры і запіваючы яго апошнім глытком Боравага цынандалі, у чым не паўторным букеце прысутнічае хлерка

Няроўны белы язык хвалі ліжа мой надпіс. На пяску застаецца толькі НАШ БЕЛАРУСЬ!

Даволі доўга я гляджу на гэтыя шматзначныя словы з каўкаскім акцэнтам Потым падымаюся і йду да Боры.

Надыходзіць чульлівая хвіліна разьвітаньня Я люблю Бору Гальперашвілі і адчуваю патрэбу сказаць яму нешта цёплае Наш чацьверты дыялёг зусім каротkі

— Калі ты прыедзеш на Беларусь — кажу я — цябе будуць зваць Гальпяровіч.

Не азіраючыся, каб не пусьціць скупую мужчынскую сьлязіну, я іду ў авіякасу

Лістапад 1991

які схаваны ад нас праз першародны грэх Я кажу пра слова, якое вучыць нас навукі Кабалы

Вучань адказаў безуважна

— Прашу ў цябе міласьці паказаць мне зьнікненьне й зьяўленьне ружы Мне ня йстотна, чым ты гэта ўчыніш — рэтортамі або Словам

Падумаўшы, Парацэльс сказаў

— Калі б я гэта зрабіў, ты сказаў бы што маеш справу з выяваю выкліканай падманам зроку. Цуд ня даў бы табе веры, якой шукаеш дык пакінь ружу

Маладзен паглядзеў на яго зь недаверам Майстар узьняў голас і сказаў

— А ўвогуле, хто ты такі, каб уваисьці ў дом маистра й патрабаваць ад яго цуду? Што зрабіў ты, каб заслужыць гэткага падарунку?

Тои адказаў дрыготкім голасам

— Я ведаю што не зрабіў нічога Прашу цябе у імя доўгіх гадоў, якія я правучуся ў тваім ценю, каб ты даў мне пабачыць попел, а пасьля ружу Больш ні пра што ня буду цябе прасіць Паверу сьведчаньню маіх вачэй.

Ен раптоўна схапіў пунсовую ружу, якую Парацэльс быў паклаў на пюпітры, і кінуў яе у полымя Кветка зьнікла засталася толькі жменька попелу Бясконцую хвіліну ен чакаў словаў і цуду.

Парацэльс заставаўся непарушны Зь дзіўнай простасьцю ен сказаў

— Усе мэдыкі й аптэкары ў Базэлі цьвердзяць, што я ашуканец Відаць, яны маюць рацыю. Вось попел, які быў ружаю й ніколі ею ня будзе

Юнаку зрабілася сорамна Парацэльс быў шарлатанам або простым летуценьнікам, а ён, нязваны уварваўся да яго і вымушаў цяпер прызнацца што ягоныя славутыя цудадзейныя умсьні — пусты падман

Ен укленчыў і сказаў

— Я учыніў недаравальнае. мне не ставала веры, якои патрабуе Госпад ад сваіх верных Хаи я заўсёды буду бачыць толькі попел. Я вярнуся, калі буду мацнейшы і стануся тваім вучнем, і у канцы Шляху я пабачу ружу

Ен гаварыў са шчырым запалам, але запал гэты быў абуджаны шкадаваньнем да старога майстра, такога шанаванага й ганьбаванага, такога славутага і урэшце такога пустога. Хто такі ён, Ёган Грызэбах, каб сьвятакрадна выявіць, што за маскаю нікога няма?

Пакідаць грошы не выпадала Выходзячы ен сабраў іх назад у ворак Парацэльс правёў яго да падножжа лесьвіцы й сказаў, што заўсёды будзе рады яму ў сваім доме Абодва ведалі, што ніколі больш не пабачацца

Парацэльс застаўся адзін Перш чым згасіць лямпу й сесьці ва ўтульны фатэль, ён высыпаў жменьку попелу сабе на далонь і ціхім голасам сказаў адно слова Ружа ўваскрэсла

Пераклаў з гішпанскай SS



Novaja Kulturnaja Situacyja


Sto adbyłosia i što adbyvajecca sionnia myślicca jak Novaja Kulturnaja Situacyja.
Heta toj krajavid jaki pačynajecca za voknami našaha ciahnika
My jašče nia ŭbačyli jaho jak krajavid, bo našuju uvahu pryciahvaje milhacieńnie niazvykłych budynkaŭ i drevaŭ, jakija tak raptoŭna źjaŭlajucca i źnikajuć za vaknom.
Niečakanyja košty, paradki, dziŭnyja miždziaržaŭnyja pahadnieńni, adstaŭki, rejtynhi, abiacańnie vajny...
My hladzim na ŭsie vočy, i novy pejzaž vyhladaje spantanna i chaatyčna
Ale tam za budynkami j drevami, za plakatami j pomnikami za ŭsim hetym strakacieńniem chto zachoča, užo moža ŭbačyć pavolnuju liniju dalahladu pahorki, nad jakimi ŭstaje sonca
Heta Novaja Kulturnaja Situacyja, u jakuju zajaždžaje naš šumlivy ciahnik My musim pryniać jaje, a jana nas.
Pobač u vahonie niechta natužliva kryčyć pra patrebu adradžeńnia niechta — pra daremna pražytaje žyćcio, niechta — pra apatyju mas. Tut adnyja kličuć da zmahańnia z druhimi, a trejcija dbajuć pra vyhodnaje miejsca ŭ novaj herarchii bahatych i biednych...
Ale ŭsio heta — čmurnyja nastroi na prykancy doŭhaha padarožža.
Neiŭzabavie ciahnik spynicca, i kožny pojdzie ŭ svoj bok. Chto da vahzalnaje pačakalni chto ŭ milhacieńnie adstavak i rejtynhaŭ, a chto — da pavolnych pahorkaŭ nad jakimi ŭstaje sonca

Выданьне гэтага нумару НН ажыцьцёўленае дзякуючы фінансавай падтрымцы Беларускага Фонду Культуры

БЕЛАРУСКІ ФОНД КУЛЬТУРЫ БФК

Радыё «Свабода»

Беларуская праграма



У нашаи праграме прапануем вам сусьветныя навіны і палітычныя камэнтары на міжнародныя тэмы
Весткі зь беларускіх гарадоў і вёсак, і пра беларускае жыцьцё за мяжой ды на эміграцыі.
Паведамленьні, камэнтары і аналізы, падрыхтаваныя нашымі мясцовымі карэспандэнтамі.
Рэлігійныя гутаркі і сэрыі на беларускія гістарычныя і культурныя тэмы

штодня а гадзіне	на хвалях
6 00—7.00	25,31,41,49 м
7 00—8 00	25,31,41,49 м
17 00—18.00	25,31,41,49 м
20.00—21.00	25,31,41,49 м

Адрас для карэспандэнцыі
Postfach 221425, D-8000 Muenchen, Germany — Нямеччына

Фірма **АГУЛ** прапануе:

- Будаўнічае праектаваньне новых і рэканструкцыю старых будынкаў, збудаваньняў і інжынэрных сістэмаў вэнтыляцыі, ацяпленьня цепла- і водазабесьпячэньня, каналізацыі.
- Сантэхнічнае абсьледваньне вэнтвыкідаў.
- Вызначэньне нормаў дапушчальных выкідаў і кантроль ГДВ
- Пуска-наладку вэнтсыстэмаў на праектныя расходы паветра
- Выпрабаваньне й наладку пылагазалавільных установак.
- Складаньне экалягічных пашпартаў.
- Выканаўчае складаньне дакумэнтацыі цепласетак
- Наладку сістэмаў цеплазабесьпячэньня і цепласпажываньня
- Наладку кантрольна-вымяральных прыбораў і аўтаматыкі.
- Складаньне каштарысаў на праектныя работы экспэртыза каштарысна дагаворнай дакумэнтацыі.
- Распрацоўку статутаў МП і таварыстваў з абмежаванай адказнасьцю.

Наш адрас: 220131, Менск-131, п/с 417. Тэл 61-21-78 і 65-78-00

Генадзь Сагановіч

НЕВЯДОМАЯ ВАЙНА

Невядомая вайна — гэта вайна з Масcкоўскай дзяржавай 1654-1667 гадоў, самая стратная для Беларусі за ўсю яе гісторыю Акупанты зьнішчылі кожнага другога жыхара нашага краю разрабавалі ды зруйнавалі амаль усе беларускія гарады й вёскі

Гісторык Генадзь Сагановіч на грунце архіўных зьвестак аднавіў карціну таго часу, распавёў пра жорсткія бітвы, пра ганебную чыннасьць маскоўскіх акупантаў на беларускай зямлі, пра абарончыя дзеяньні беларускага войска й беларускіх партызанаў...

Калі вам патрэбная такая кніга, паспрыяйце яе выданьню. Дзеля гэтага ў любой кнігарні можна аформіць паштоўку замову. Кнігу «Невядомая вайна» ў 1992 годзе пляную выпусьціць менскае выдавецтва

«БЕЛАРУСЬ»

Ад Рэдакцыі

Ахвяраваньні

На выданьне НН ахвяравалі:
Генрых Вярцінскі з Украіны 30 р
Вітаўт Ермалёнак зь Мёраў 20 р
Сяржук Х. з Жодзіна 10 р.
Соф'я Фейгіна з Гомля 40 р
Валянцін Стэх зь Вільні 25 р
Клюб «Сябрына» зь Вільні 100 р
Ермаловіч і Каробка з Фаніпаля 25 р
І.Ярош з Барысаўскага раёну 25 р
Уладзімер Аляксееў зь Менску 100 р
Р.Грудніцкі з Наваполацку 50 р.
Валеры Палсыцюк зь Менску 60 р
Г.Ермаловіч з Койданава 25 р
Б.Родзіч зь Менску 30 р.
Галіна Кароль зь Менску 30 р

Вялікі дзякуй!

Шаноўныя чытачы, калі Вы хочаце и можаце дапамагчы ў выданьні *Нашае Нівы*, дапамажыце.
Фундацыю на *НН* трэба перaказваць поштай на адрас:

232051 Вільня, а/с 2425, Кардзіс Людвіка, ці
220131 Менск, а/с 229 Чубрык Кацярына

альбо на наш фінансавы адрас:

Камэрцыйны банк «Vilniaus bankas»
рахунак № 3467685
код 260101777,
Закрытае акцыйнае таварыства
«Наша Ніва».

Паштовая скрынка

Рыгору Г. з Наваполацку. Прафэсіяналізацыя беларушчыны — ня толькі ў фінансавай незалежнасьці, хоць гэта й істотна І ня толькі ў «падключэньні» дзярж установаў, хоць і гэта неабходна. Прафэсіяналізацыя яшчэ і ў пераадоленьні тае прорвы, якая падзяляе нашыя пафаснаўзьнёслыя адносіны да Бацькаўшчыны і нашае ж рэальнае жыцьцё... Мы са зьдзіўленьнем адкрываем для сябе ўласную краіну — Эўфрасіню з роду Ўсяслава імклівую Пагоню, трапяткое роднае слова... і, натуральна, прагнем падзяліцца сваім уражаньнем, замілаваньнем, гонарам зь іншымі. Тут і чакаюць нас досыць частыя няўдачы. Адныя тады думаюць пра фін. незалежнасьць, каб і далей захапляцца, хай сабе толькі для сябе. Другія — пра дзяржаўныя ўстановы, каб сілай закону «перадаваць» сваё захапленьне іншым. Трэйція пранікаюць, скажам так, у самую беларушчыну, становяцца яе працягам у сучаснасьці, пераацэньваюць яе і інтэрпрэтуюць так, каб яна апынулася на другім беразе прорвы — у рэальным жыцьці. Беларушчына — не сукупнасьць формулаў новае ідэалёгіі, а магчымасьць тварыць
А.К. зь Менску. Верш слабы.
Андрэю Г. з Оршы. Вашая інфармацыя састарэла, але чакаем новых. Пішыце як жывеце
Віктару Н. з Масквы У Вашай «фантазіі» не ўказана, колькі Вы адзначаеце чалавечых ахвяраў з абедвух бакоў. А наогул, усё гэта ўжо было. Напісалі б пра тое, што будзе пасьля перамогі

Шляхецтва

Сеньня гэта — забава
а заўтра, магчыма, —
эканамічная праблема
Калі Вашыя продкі — шляхецкага роду
і Вы хочаце мець выяву
сваиго гербу,
генэалягічную схему
ды іншыя дакументы пра свой род
мы дапаможам Вам
Узгадайце хоць бы некалькі імёнаў
Вашых продкаў (дзядоў і прадзедаў)
мясцовасьць іхняга паходжаньня
ці зямельных уладаньняў
назву герба.
Узгадайце
і разам з дакладным напісаньнем
Вашага прозьвішча
дашліце нам,
на адрас Рэдакцыі.
Вы абавязкова атрымаеце адказ.
Пры наяўнасьці паштовага перакazу
на 25 р.
Наш архіў адразу пачне пошук.
Калі Ваш радавод зацікавіць рэдакцыю
й Вы самі ня будзеце супраць,
мы надрукуем матэрыялы ў газэце
У іншым выпадку
за дадатковую аплату
мы дашлем Вам матэрыялы
персанальна

Падпіска

Наша Ніва — газэта для Вас і Вашых сяброў. Каб падпісацца на *Нашу Ніву* перашліце адвольную суму грошай на адрас: **232051, Вільня, а/с 2425, Кардзіс Людвіка**, альбо **220131, Менск, а/с 229, Чубрык Кацярына** Калі Вы атрымаеце нумароў на дасланую суму, мы паведамім Вам, што падпіску трэба працягнуць. Калі Вы жывеце ў Польшчы, грошы трэба пералічыць на конта **5526 80725-136 II PKO Białystok. Pismo Informacyjno-Kulturalne Wschodniej Białostocczyzny** *Czasopis* **(dla** *Našaje Nivy*). Кошт аднаго нумару 1000 злотых. Штосьці ўдакладніць можна па адрасе: 15-950 Białystok, ul. Suraska, 1. P.skr. 149. Tel. 210-33. У астатнім сьвеце падпіску зьбірае Сяргей Карніловіч з Кліўленду па адрасе: Byelarusian-Amerikan Community Center "Połacak", 11022 Webster Road, Strongville, OH 44130 U.S.A Attn: Mr. S.Karniłovič.

Наша Ніва
Naša Niva

Беларуская газэта
заснаваная ў 1906 г.
адноўленая ў 1991 г

Рэдакцыйная Рада
Выдавец Павал Жук
Закрытае Акцыйнае Т-ва «Наша Ніва

Адрас для допісаў:
232041, Вільня, а/с 2082
Адрас для грашовых перaказаў:
232051, Вільня, а/с 2425. Кардзіс Людвіка

Афсэтны друк
Друкарня МАЎ

Замова

© Naša Niva, 1992